ПРАЛЕТАРЫ ЎСЯГО КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 132 (3240) Чацьвер, 13-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫО НОЧЫ:

СТАКГОЛЬМ, 12. Апублікаваны маніфэст Нарвэскае кампартыі, камсамола і рэвалюцыйнае меншасьці прафсаюзаў, прысьвечаны антыімпэрыялістычнаму дню 1 жніўня. Маніфэст зазывае рабочую клясу дэманстраваць 1-га жніўня на абарону СССР, супроць падрыхтоўкі вайны і за ператварэньне яе ў грамадянскую вайну.

АПОШНІЯ НАВІНЫ

АСІНБУД. (Наш кар.). Гатова лінія перадачы току высокага напружаньня на Віцебск. У канцы лета пачнецца нацяжка дроту. У хуткім часе ў Віцебску пачнецца пабудова паніжальнай падстанцыі; пабудова будзе скончана ў гэтым сэзоне.

Міжнародны дзень барацьбы супроць вайны

6-ты кангрэс Камінтэрну паставіў, як апошнюю задачу міжнароднага камуністычнага руху—барацьбу супроць вайны і падрыхтоўкі нападу на СССР. Камінтэрну не патрэбна дэклямацыя супроць вайны, дэклямацыя, якая зьяўляецца, як вядома, спэцыяльнасьцю гэрояў 2-га інтэрнацыяналу.

Кангрэс Камінтэрну парашыў вызначыць міжнародны дзень барацьбы супроць вайны. Гэтым самым праблема барацьбы супроць вайны вынесена на вуліцу. Ужо пасьля кангрэсу Камінтэрн назначыў гэту дэманстрацыю на 1-га жніўня бягучага году. **Гэты дзень выбран для таго, каб супроцьпаставіць камуністычную чыннасьць рэфармісцкай фразе.** Гэты дзень выбран таму, што першага жніўня міжнародны рэфармізм у асобе 2-га Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу абвяшчае «барацьбу» супроць вайны.

Бароны жалеза і сталі, каралі хіміі і іх сацыял-дэмакратычныя лёкаі ведаюць, што для Камінтэрну барацьба супроць вайны—не фраза, таму яны ўжо зараз рыхтуюцца сустрэць міжнародную дэманстрацыю 1-га жніўня.

Сацыял-дэмакраты сьцьвярджаюць, што той факт, што ў дзьвюх буйнейшых краінах Эўропы (Антлія і Нямеччына, на чале ўлады стаяць дзеячы 2-га інтэрнацыяналу, абясьпечвае справу міру. **Гэта—бессаромная хлусьня. Буржуазія рыхтуе вайну рукамі гэтых самых крывадушных «пацыфісцкіх» самаўладцаў.**

Пытаньне аб міжнародным дні барацьбы супроць вайны ня толькі ня зьнята з прыходам да ўлады ўраду рабочае партыі ў Англіі, але яно ставіцца для Антлії і для падуладных ангельскай буржуазіі краін пановаму.

У Вялікабрытаніі і падуладных ёй калёніх, асабліва ў Індыі, 1-е жніўня набывае асаблівае значэньне, бо не падлягае ні малейшаму сумненьню тое, што ўвесь апарат прыгнечаньня будзе мабілізаваны для задушэньня самых нязначных спроб працоўных дэманстраваць супроць вайны і брытанскага імпэрыялізму.

Наколькі можна судзіць з атрыманых да гэтага часу вестак, **ідэя міжнароднага дня супроць вайны сустрэла вялікае спачуваньне ва ўсіх краінах.** Ужо ідзе ліхаманкавая падрыхтоўка да гэтага дня. Камінтэрн, Прафінтэрн і арганізацыі, што да іх далучаюцца, узмоцнена — рыхтуюцца да міжнароднай анты-ваеннай дэманстрацыі. Неабходна з максымальнай энэргіяй скарыстаць рэшту часу, каб 1-е жніўня сапраўды быў днём масавае актыўнасьці, днём падліку рэвалюцыйных сіл, днём міжнароднага агляду сваіх сапраўдных прыяцеляў СССР.

Наша партыя, зьяўляючыся самай моцнай сэкцыяй Камінтэрну, павінна прыняць самы актыўны ўдзел у міжнародным чырвоным дні. У дзень 1-га жніўня савецкі пралетарыят будзе дэманстраваць сваю салідарнасьць і з рабочымі Нямеччыны, Антлії, і з бастуючымі тэкстыльшчыкамі Бамбэю і з нэграмі, якіх прасьледуюць у ПАЗШ, і з рабочымі ўсяго Ціха-акіянскага ўзьбярэжжа і ўсіх калёніяльных і напаўкалёніяльных краін.

Савецкі пралетарыят зноў давядзе сваю арганічную сувязь з міжнародным рабочым рухам і сваю глыбокую прывязанасьць да асноўных ідэй, агалошаных у Кастрычніку 1917 году.

Няхай міжнародная буржуазія і міжнародная сацыял-дэмакратыя абураецца супроць ўсягэтага дня. Няхай яны малююць ўсялякія жудасьці для таго, каб падняць супроць рабочых запалоханага абываталя, няхай гэрої 2-га Інтэрнацыяналу—пацыфісцкія ханжы і сацыял-дэмакратычныя балбатуны адгаварваюць рабочых ад выступленьня ў дзень 1-га жніўня. **Рабочая кляса капіталістычных краін не спалохаецца пагроз і ня пойдзе з сацыял-дэмакратычнымі прыслужнікамі.**

Яна будзе дэманстраваць сваю волю да барацьбы супроць імпэрыялізму, супроць вайны, у абарону СССР. Разам з тым і савецкі пралетарыят будзе ў гэты дзень дэманстраваць за гэтыя лёзунгі Камінтэрну, ва лёзунгі міжнароднага камуністычнага руху. Няхай жыве міжнародны дзень барацьбы супроць вайны.

(«Правда»)

ЗЬЕЗД НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ

Адыход рабочых ад сацыял-дэмакратыі.—Рост небясьпекі вайны супроць СССР. Пераможны нямецкі пралетарыят разарве ланцугі пляну Юнга і Вэрсальскае згоды.—Рэвалюцыйныя рабочыя Нямеччыны не дазволяць задушыць кампартыю

Даклад тав. Тэльмана

АБВАСТРЭНЬНЕ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ ПАДРЫВАЕ КАПІТАЛІСТЫЧНУЮ СТАБІЛІЗАЦЫЮ

БЭРЛІН, 11. На зьезьдзе нямецкай кампартыі т. Тэльман у сваім дакладзе падкрэсьліў, што цяперашні 12-ты зьезд партыі мае вялізнае значэньне ня толькі для Нямеччыны, але і ў міжнародным маштабе. Зьявы міжнароднага жыцьця ў апошні час цалкам пацьвярджаюць рэзалюцыі 6-га суьветнага кангрэсу Камінтэрну. аб абвастрэньні супярэчнасьцей як паміж паасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі, так і паміж капіталам і працаю.

Фашысцкая небясьпека ніколі не пагражала так моцна міжнароднаму пралетарыяту, як зараз. Асабліва небясьпечным зьяўляецца сацыял-фашысцкае разьвіцьцё сацыял-дэмакратыі, якое для Нямеччыны адыгрывае рашаючую ролю. **Кааліцыйны ўрад Нямеччыны на чале з сацыял-дэмакратамі працягвае работу ўраду буржуазнага блёку; таксама ўрад рабочае партыі ў Англіі будзе па сутнасьці працягваць палітыку кансэрватыўнага габінэту.**

Побач з гэтым у паасобных краінах абвастраецца клясавая барацьба, якая падрывае капіталістычную стабілізацыю.

ПАДРЫХТОЎКА ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЕ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР

Далей т. Тэльман адзначыў, што разам з ростам клясавых супярэчнасьцяй ва ўсіх краінах, расьце небясьпека імпэрыялістычнае вайны супроць СССР. Зараз,—сказаў т. Тэльман,—наступіла ўжо фаза арганізацыйнай падрыхтоўкі гэтай вайны. Абстаноўка рэпарацыйных перагавораў у Парыжы, арганізаваныя напады банд на савецкую тэрыторыю, што мяжуецца з Аўганістанам, учынкі кітайскіх улад у адносінах да СССР, польска-румынскі сакрэтны дагавор і дыпляматычныя крокі нямецкага ўраду ў Маскве, пасьля майскіх падзей,—усё гэта сыгналізуе небясьпеку імпэрыялістычнае вайны супроць СССР.

«ВІТАЕМ ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ—АБАРОНЦУ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ»

Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР усё больш узмацняе сярод імпэрыялістых упэўненасьць у тым, што ўсякае адтэрмінаваньне вайны робіць пазіцыі СССР яшчэ больш непарушнымі і непераможнымі, чым цяпер.

Пры мабілізацыі мас, на барацьбу супроць імпэрыялістычнае вайны, у прыватнасьці, пры правядзеньні міжнароднага баявога анты-імпэрыялістычнага дня 1-га жніўня, нямецкая кампартыя павінна растлумачыць масам, што цяперашняе наступленьне капіталу, а таксама фашысцкая палітыка прыгнечаньня рабочае клясы, якую праводзіць буржуазія,—зьяўляюцца падрыхтоўчай ступеньню да вайны супроць СССР.

Падрабязна ахарактарызаваўшы дасягненьні і далейшыя віды сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, Тэльман заявіў:

«Ад імя нямецкае камуністычнае партыі, якая прадстаўляе рэвалюцыйны пралетарыят, мы вітаем адгэтуль Чырвоную армію—абарончую арганізацыю сусьветнага пралетарыяту і пасылаем ёй братэрскае баявое прывітаньне».

БАЛЬШАВІЗАЦЫЯ КАМІНТЭРНУ

Далей тав. Тэльман адзначыў, што абвастрэньне агульнага міжнароднага становішча, паляваньне мас і адыход рабочых ад сацыял-дэмакратыі прывялі да ўзмацненьня кампартыі. Выключэньне з камуністычных радоў ліквідатарскіх элемэнтаў, зьнішчэньне прымірэнчых ухілаў, больш сьвядомае правядзеньне нпрымірочай барацьбы супроць рэфармізму і перанесеньне цэнтру цяжару партыйнае работы на прадпрыемствы—вось важнейшыя адзнакі бальшавізацыі Камінтэрну.

РЭПАРАЦЫЙНАЕ ПЫТАНЬНЕ

Што датычыць становішча ў Нямеччыне, дык хуткая зьмена кан'юнктуры паказвае, што нямецкая гаспадарка перажывае асаблівыя цяжкасьці, галоўнай прычынай якіх зьяўляецца якраз супярэчнасьць паміж яе вытворчымі магчымасьцямі і скарачэньнем рынкаў збыту.

Дакрануўшыся рэпарацыйнага пытаньня, Тэльман падкрэсьліў, што адносіны нямецкае кампартыі па гэтым пытаньні прынцыпова адзначаюцца ад адносін да яго з боку клясавых ворагаў пралетарыяту. З пункту гледжаньня клясавае барацьбы, рэпарацыйныя пляцяжы азначаюць падвойную эксплёатацыю пралетарыяту, з якога будуць выціскаць прыбытак ня толькі для нямецкіх капіталістых, але і для буржуазій дзяржаў-пераможцаў. Рэпарацыйны цяжар нямінуча пацягне за сабою страшэннае абвастрэньне капіталістычнай эксплёатацыі, якая можа быць дасягнута толькі пры дапамозе сацыял-фашысцкай сацыял-дэмакратыі. Нямецкая кампартыя супроцьставіць сваё рэвалюцыйнае вырашэньне пытаньня буржуазнаму і сацыял-фашысцкаму разуменьню рэпарацыйнае праблемы. **Падобна таму, як бальшавікі анулявалі царскія даўгі пасьля заваёвы ўлады і анулявалі Берасьцейскую згоду пасьля ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту,—кажа т. Тэльман,—таксама і пераможныя нямецкі пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, разарве ланцугі пляну Юнга і Вэрсальскае згоды.**

Далей, тав. Тэльман адзначыў, што заснаваньне банку міжнародных разьлікаў таксама мае асобнае значэньне, таму што гэты банк будзе рэгуляваць курс валюты дзяржаў, якія ўступяць у вайну супроць СССР.

ФАШЫЗАЦЫЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫІ

Потым т. Тэльман перайшоў да падрабязнае характарыстыкі ролі сацыял-дэмакратыі. Супярэчачы прымірэнцам, ён падкрэсьліў, што галоўная небясьпека—не ў буржуазнай дэмакратыі, а ў разьвіцьці фашызму і ў сацыял-фашысцкім шляху разьвіцьця сацыял-дэмакратыі. Аднэй з важнейшых задач нямецкае кампартыі зьяўляецца выкрыцьцё сутнасьці сацыял-фашызму.

ПЕРАМАГАЦЬ ХІСТАНЬНІ ВА ЎЛАСНЫХ РАДОХ

Пераходзячы да ацэнкі клясавых боек у Нямеччыне, Тэльман падкрэсьліў, што рабочая кляса адказвае на наступленьне капітала контр-наступленьнем, якое набывае характар рэзкіх сутычак паміж рэфармізмам і камунізмам, паміж пралетарыятам і капіталістычнай дзяржавай. Барацьба за павышэньне зарплаты ў сучасны момант у Нямеччыне набывае палітычны характар. Пры гэтым трэба падкрэсьліць, што тактыка адзінага фронту ажыцьцяўляецца цяпер значна горш, чым у час кампаніі супроць пакрыцьця страт былых княжэўскіх дамоў. Пры правядзеньні гэтае тактыкі трэба ня толькі весьці самую рэзкую барацьбу супроць рэфармізму і сацыял-фашызму, але і перамагаць таксама хістаньні ва ўласных радох. **Прымірэнцы адыгрываюць цяпер ролю правых. Пры гэтым т. Тэльман задаў прымірэнцам запытаньне, ці хочуць яны і надалей стаяць на пазіцыі трусьлівага апартунізму, або гатовы зрабіць выбар паміж лініяй партыі і ліквідатарамі, бо трэцяга рашэньня быць ня можа.**

ПАРТЫЯ НЕ ПАДДАЛАСЯ НА ПРАВАКАЦЫЮ ЦЭРГІБЭЛЯ

Пераходзячы да характарыстыкі бэрлінскіх майскіх падзей, Тэльман падкрэсьліў, што яны зьяўляюцца паваротным пунктам усяго палітычнага разьвіцьця сучаснай Нямеччыны. Адказнасьць за майскае крывапраліцьце ляжыць на сацыял-дэмакратычным паліцэй-прэзыдэнце Цэргібэлі, які, забараніўшы дэманстрацыі, растаптаў першамайскую традыцыю міжнароднага пралетарыяту. Мэта правакацыі Цэргібэля заключалася ў тым, каб ізаляваць кампартыю ад мас і штырхнуць яе на шлях заўчаснага паўстаньня, якое адкінула-б яе далёка назад. Калі-б кампартыя паддалася стыхійнаму настрою мас, дык тым самым яна паддалася-б на правакацыю паліцыі і лепшая частка бэрлінскіх рабочых была-б перабіта. Партыя зрабіла зусім правільна, высунуўшы, замест таго лёзунг масавай палітычнай забастоўкі.

Тав. Тэльман потым зазначыў, што ёсьць досыць данных, якія паказваюць на надыходзячы роспуск кампартыі. **Але рэвалюцыйныя пралетарыят не дазволіць задушыць кампартыю.** Арганізацыя, зьнітаваная пралетарскай таварыскасьцю міжнароднае салідарнасьці рабочае клясы і абавязкам абароны СССР, ня можа быць зьнішчана ні пры дапамозе папяровае паліцэйскае забароны, што выдаюць сацыял-фашыстыя, ні пры дапамозе іншых мер. Партыя павінна правесьці на прадпрыемствах самую шырокую мабілізацыю мас супроць пагражаючага роспуску.

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ

Канец дакладу т. Тэльман прысьвяціў чарговым задачам партыі. Галоўныя задачы партыі—барацьба з падрыхтоўкаю імпэрыялістычнае вайны супроць СССР, кампанія, зьвязаная з правядзеньнем міжнароднага анты-ваеннага дня 1-га жніўня, разгортваньне шырокіх клясавых боек у эканамічнай галіне, разьвіцьцё эканамічнае барацьбы ў палітычныя выступленьні супроць буржуазнае палітыкі прыгнечаньня і супроць небясьпекі сацыял-фашысцкае дыктатуры.

Тактычныя задачы партыі заключаюцца ў заваяваньні большасьці ў равшаючых пластох рабочае клясы. Галоўнейшымі ўнутрыпартыйнымі задачамі зьяўляецца ўстаноўка партыі на новыя ўмовы барацьбы, актывізацыя членскае масы, прыцягненьне новых кадраў, разьвіцьцё самакрытыкі, самая суровая рэвалюцыйная дысцыпліна, поўнае адзінства і згуртаванасьць партыі. Даклад т. Тэльмана быў спатканы доўгімі гучнымі воплескамі.

Пасьля дакладаў т. Гэбіха аб дзейнасьці нямецкага камсамолу і т. Авэрлах аб рабоце сярод працоўных жанчын, на зьезьдзе нямецкае камуністычнае партыі сёньня пачаліся спрэчкі на дакладу т. Тэльмана. Усе выступаўшыя дагэтуль прамоўцы падкрэсьлівалі бязумоўную правільнасьць лініі Камінтэрну і нямецкае кампартыі і спыняліся на задачах, што стаяць перад партыяй на бліжэйшы пэрыяд.

Суд над забойцам правакатара Гурына

Бястэрміновая катарга за забойства правакатара

ВІЛЬНЯ, 11. 16 сакавіка 1928 г., а 10 гадз. увечары ў аднэй з віленскіх кафэйняў (на Ягэлёнскай вул.) некалькімі стрэламі з рэвальвэру быў забіты адзін з найбуйнейшых правакатараў Заходняе Беларусі—Міхась Гурын. Якраз, у гэты час, у віленскім акруговым судзе слухаўся працэс «Грамады». І пракуратура і суд лезьлі, што называецца, «з скуры вон», каб давесьці, што стотысячная арганізацыя заходня-беларускіх працоўных мас ёсьць проста купка змоўцаў і шпіёнаў, якія знаходзяцца на ўтрыманьні «сумежнае дзяржавы» і працуюць па яе заданьнях. Але гэтая няўдалая, нацягнутая байка не вытрымлівала нават самае лёгкае крытыкі абаронцаў. І пракуратура, і суд напалі ў дрэннае становішча. Каб выйсьці з яго, было пастаноўлена выпусьціць на судовую сцэну вядомага правакатара Міхася Гурына.

Вестка, што гэты здраднік выступіць на судзе, каб «сьцьвердзіць» і «падтрымаць» недарэчныя байкі абвінавачаньня, выклікала надзвычайнае абурэньне ў заходня-беларускіх працоўных масах, а ў далейшым выніку—стрэлы на Ягэлёнскай вуліцы.

Забойца правакатара Гурына быў злоўлен і ў панядзелак 10-га чэрвеня г. г. судзіўся ў віленскім акруговым судзе.

Паводле вестак абвінаваўчага акту, забойца правакатара Гурына пасьля забойства прабаваў уцячы, але на Гданскай вуліцы яго затрымаў вартаўнік.

Пасьля арышту, забойца правакатара назваў сябе Антонам Пякарскім і паказаў пашпарт, выданы Слонімскім старостам. Адносна матываў забойства ён паказаў, што забіў Гурына па ідэёвых матывах, як здрадніка беларускіх працоўных мас, прычым, дзейнічаў зусім самастойна, без папярэдняе згоды з трэцімі асобамі.

Далейшае сьледзтва выявіла, што сапраўднае прозьвішча Пякарскага—Сымон Клімцэвіч, 29 год, жыхар м. Трабы, Валожынскага павету.

Сьледзтва вялося больш году, прычым галоўнаю мэтаю яго было выкрыцьцё ўдзельнікаў «змовы», якія нібы-та падбухторвалі Клімцэвіча да забойства Гурына, але гэтая мэта так і засталася недасягнутаю.

Слухалася справа Клімцэвіча пад старшынством судзьдзі Мілашэвіча; абвінавачваў пракурор Калапскі (які выступаў і на працэсе «Грамады»); абараняў адвакат Дурач з Варшавы.

На суд было выклікана 20 сьведак з боку абвінавачаньня і толькі адзін сьведка з боку абароны (брат Клімцэвіча). Апрача таго было выклікана 4 экспэрты.

Пры допыце на судзе Клімцэвіч усе адказы даваў па-беларуску. У адказ на пытаньне аб матывах забойства, Клімцэвіч сказаў вялікую прамову аб здрадніцкай ролі Гурына ў рэвалюцыйным руху. **Клімцэвіч лічыў Гурына здраднікам рэвалюцыйнага руху і сам, без чыйго небудзь падбухторваньня, парашыў яго забіць.**

У ліку сьведак абвінавачаньня выступаў між іншым і Ф. Умястоўскі, былы рэдактар польскага фашысцкага тыдзьвіка на беларускай мове «Беларускі дзень». У гэтым тыдзьвіку супрацоўнічаў і Гурын. Паводле слоў Умястоўскага, Гурын ня раз заяўляў, што на яго жыцьцё рыхтуецца замах, і пагрозу замаху настолькі паважна ацэньваў, што не гаварыў нікому, дзе ён жыве.

Пракурор у сваёй прамове патрабаваў кары сьмерці.

Каля 12-й гадзіны ўночы быў абвешчан прыгавор, якім Клімцэвіч засуджан на бястэрміновую катаргу.

Напярэдадні аднаўленьня англа-савецкіх адносін

Дзелавыя колы за прадастаўленьне СССР экспартных крэдытаў

АНГЕЛЬСКІ ГАБІНЭТ АБГАВАРВАЕ ПЫТАНЬНЕ АБ АДНОСІНАХ ДА СССР

ЛЁНДАН, 11. Паводле вестак карэспандэнта ТАСС, на першым пасяджэньні новага габінэту абгаварваліся наступныя асноўныя пытаньні: англа-амэрыканскія адносіны, пытаньне аб аднаўленьні адносін з СССР і пытаньне аб беспрацоўі.

Карэспандэнт ТАСС у гутарцы з членамі парляманцкае фракцыі рабочае партыі запытаўся, якая найбольш жыцьцёвая форма наладжаньня першага кантакту з савецкім урадам. Пасьледаваў адказ: «Гэта справа простая. Пошта і тэлеграф адкрыты для ўсіх.

ПРАДАСТАЎЛЕНЬНЕ КРЭДЫТАЎ СССР ПАЛЕГЧЫЦЬ БАРАЦЬБУ З БЕСПРАЦОЎЕМ

ЛЁНДАН, 11. Палітычны агляльнік «Дэйлі Гэральд» меў гутарку з радам прадстаўнікоў ангельскіх дзелавых колаў. Заява Гэндэрсона, што ўрад рабочае партыі **намеран наладзіць адносіны з СССР на больш моцным грунце, як гэта мела месца ў мінулым, спаткала аднадушную згоду з боку дзелавых колаў.**

Некаторыя з прадстаўнікоў дзелавых колаў выказалі думку, што пашырэньне схэмы экспартных крэдытаў на СССР магло-б дапамагчы Томасу ў ажыцьцяўленьні яго пляну барацьбы з беспрацоўем.

ПЕРАГАВОРЫ ПРАЦЯГНУЦЦА НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ

ЛЁНДАН, 11. Дыплёматычны агляльнік «Дэйлі Тэлеграф» піша:

«Аднаўленьне дыплёматычных адносін можа зьявіцца толькі вынікам папярэдніх перагавораў, якія патрабуюць некалькіх тыдняў. Істотнай умовай нармальных адносін паміж Лёнданам і Масквою павінна быць згода аб узаемным неўмяшаньні ва ўнутраныя справы. Як толькі дыплёматычныя адносіны будуць адноўлены, Гэндэрсон пяройдзе да пытаньня аб фінансавай згодзе».

ДА ЗЬЕЗДУ ПАЛЯКАЎ, ШТО ЖЫВУЦЬ ПА-ЗА МЕЖАМІ ПОЛЬШЧЫ

Учора адбылося першае паседжаньне Менская грамадзкага камітэту па правядзеньні выбараў на Варшаўскі зьезд прадстаўнікоў—палякаў, што жывуць па-за межамі Польшчы.

На гэтым паседжаньні быў абраны прэзыдыум у складзе старшыні—т. Чэрвонка (рабочы гарбарні «Бальшавік») і адказнага сакратара т. Будкевіч—павуковая работніца БДУ і Акадэміі Навук.

Камітэт наважыў зараз-жа зьвязацца па тэлеграфу з ужо існуючымі такімі-ж акруговымі камітэтамі ў БССР і на 13-га чэрвеня склікаць іх прадстаўнікоў для арганізацыі цэнтральнага грамадзкага камітэту БССР, для выбараў дэлегатаў на Варшаўскі зьезд.

Камітэт пастанавіў неадкладна прыступіць да правядзеньня выбараў дэлегатаў па ўсіх населеных пунктах Менскае акругі з польскім працоўным насельніцтвам.

Для правядзеньня выбараў, камітэт памеціў рад упаўнаважаных. Акруговую канфэрэнцыю дэлегатаў Менскае акругі пастаноўлена склікаць на 30 чэрвеня ў Менску.

Памяшканьне для работ камітэту прадастаўіў польскі рабочы клюб імя Розы Люксэмбург.

ЦК УсеКП(б)—аб выніках перавыбараў саветаў

Вялізны рост палітычнае актыўнасьці працоўных мас гораду і вёскі.—Пад знакам далейшага разьвіцьця савецкае дэмакратыі і самакрытыкі.—Палепшыць кіраўніцтва работаю новаабраных саветаў

МАСКВА, 12. Заслухаўшы даклад пра папярэднія вынікі правядзеньня кампаніі перавыбараў саветаў у 1928-29 годзе, ЦК УсеКП(б) ухваліў наступную пастанову:

«Перавыбары саветаў наглядна выявілі абвастрэньне клясавае барацьбы ў краіне. Рост сацыялістычнага наступленьня пралетарыяту выклікае рост супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў. Кулацтва і буржуазна-эпманскія пласты вялі ўзмоцненую барацьбу супроць палітыкі савецкае ўлады, ня спыняючыся на гэтай барацьбе, побач з разгортваньнем сваёй арганізацыйна-агітацыйнай работы, перад ўжываньнем тэрару супроць актыўных савецкіх працаўнікоў і актывістых, асабліва ў вёсцы. Перавыбары адначасова выявілі вялізны рост палітычнае актыўнасьці рабочае клясы і працоўных мас гораду і вёскі, якія згуртаваліся пад лёзунгам партыі за палітыку міру і ўзмацненьне абарона-здольнасьці краіны, за шпарк і тэмп індустрыялізацыі краіны, за ўздым і сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі.

Дзякуючы гэтаму ўздыму актыўнасьці і палітычнае сьвядомасьці рабочае клясы, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, у выніку перавыбараў **дасягнута яшчэ большае ўзмацненьне кіруючай ролі рабочае клясы ў саветах і нанесен рашучы ўдар спробам кулацка-капіталістычных элемэнтаў пашырыць свой варожы савецкай дзяржаве ўплыў на некаторыя пласты выбаршчыкаў.** Наказы, прынятыя выбаршчыкамі, поўнасьцю ўхваляюць палітыку савецкае ўлады.

Сацыяльны і партыйны склад новаабраных саветаў паказвае новыя поспехі партыі ў справе ўзмацненьня пралетарскага ўплыву, уцягненьня рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас у работу саветаў і паслабленьне пазіцый кулацка-эпманскае агэнтуры. Перавыбарная кампанія саветаў прайшла ва ўмовах далейшага разьвіцьця савецкае дэмакратыі і самакрытыкі, якая дапамагала правёрцы правільнасьці клясавае лініі саветаў, барацьбе з бюракратызмам і чыстцы саветаў ад клясава-чужых і варожых. элемэнтаў. Асабліва яскрава выяўлен рост палітычнае сьвядомасьці прамысловага пралетарыяту, які праявіў цьвёрдую волю ў справе перамогі няжкасьцяй на шляху сацыялістычнага будаўніцтва і ў большасьці выпадкаў прыняў пагалоўны ўдзел у выбарах саветаў. Разам з тым значна вырасла актыўнасьць неарганізаваных пластоў працоўных гораду (саматужнікі і г. д.). Дзякуючы ўзмоцненай рабоце партыі з беднатою (сходы беднаты, групы беднаты, бядняцкія канфэрэнцыі і г. д.) у вёсцы значна падняслася арганізаванасьць і актыўнасьць батрацтва і беднаты, павысілася роля і ўплыў батрацка-бядняцкіх пластоў ва ўсім ходзе перавыбарчай кампаніі ў вёсцы. На падставе гэтага, ня гледзячы на ўзмацненьне барацьбы кулацтва за ўплыў на серадняцкія масы сялянства, партыя дасягла новых поспехаў у справе замацаваньня бядняцка-серадняцкага блёку і агульнага ўзмацненьня пазіцый пралетарскае дыктатуры ў вёсцы. Адначасова буйным поспехам зьяўляецца арганізацыя дапамогі гораду вёсцы, якая выразілася ў масавай пасыцы рабочых брыгад

Адзначаючы гэтыя палітычныя і арганізацыйныя поспехі перавыбарчае кампаніі 1928-1929 г., ЦК УсеКП(б) разам з тым падкрэсьлівае налічча ўсё яшчэ значных скажэньняў партыйнае лініі з боку раду мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый.

У многіх выпадках надзвычайна слабая яшчэ ўвага партыйных арганізацый да работы сярод батрацтва, а таксама сярод беднаты; ня гледзячы на поўныя дасягненьні, работа прафсаюзаў сельгаслесарабочых і груп беднаты патрабуе рашучага зруху ў справе арганізацыі і згуртаваньня вакол партыі новых пластоў батракоў і беднякоў. Разам з тым, у радзе выпадкаў узросшая актыўнасьць беднаты і батрацтва ня была скарыстана мясцовымі арганізацыямі ў мэтах узмацненьня пралетарскага ўплыву на серадняцкія масы сялянства, далейшага замацаваньня бядняцка-серадняцкага блёку, а ў паасобных раёнах наглядалася простая недаацэнка ролі серадняка пры выбарах саветаў. Наглядаюцца ўсё яшчэ выпадкі далучэньня савецкіх арганізацый да кулацкае верхавінкі вёскі, слабасьць адпору кулацкаму ўплыву і яго атакам супроць саветаў. У прыватнасьці, у радзе месц у сувязі з засьмечанасьцю выбаркомаў і са скажэньнем савецкага законадаўства, асабліва ўпачатку выбарчае кампаніі, мелі месца выпадкі, як прадастаўленьня выбарчых правоў кулакам, так і незаконных пазбаўленьняў гэтых правоў серадняцкіх элемэнтаў вёскі.

ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям усямерна палепшыць кіраўніцтва работаю новаабраных саветаў у справе пасьпяховага выкананьня імі вялізных задач, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі, мабілізуючы ўсе сілы рабочай клясы і працоўных мас сялянства, асабліва батрацкі і беднякоў, як апоры пралетарыяту ў вёсцы, на перамогу няжкасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва і выкароўчаньне самых каранёў капіталізму.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць у далейшым на работу па чыстцы савецкага апарату ад чужых, што разлажыліся і абюракраціліся, элемэнтаў, і далейшага палепшаньня савецкага апарату, шляхам высоўваньня і падрыхтоўкі новых кадраў, а таксама падняцьця кваліфікацыі кіруючых працаўнікоў саветаў, аказваючы ўсямерную дапамогу замацаваньню і далейшаму вылучэньню работніц і сялянак. Патрэбна ўпартай работа ў галіне далейшага ажыўленьня работы саветаў і ўсё большага ўцягненьня мас у работу. ЦК прапануе партыйным і савецкім арганізацыям вывучыць вынікі перавыбарчае кампаніі саветаў і іх сацыяльны склад, з вучотам асаблівасьцяй паасобных раёнаў (нацыянальных рэспублік і вобласьцяй і г. д.), прыняўшы ўсе меры да выпраўленьня тых недахопаў, што выявіла выбарчая кампанія ў рабоце саветаў.

Посьпехі савецкай навукі

На двух вучастках савецкай навукі адначасова выявіліся буйныя посьпехі, якія маюць вялікае гаспадарчае значэньне.

Пасьля доўгіх выпрабаваньняў і досьледаў, праф. Грыгаровіч прышоў да заключэньня, што пытаньне аб уласнай вытворчасьці ў Саюзе неіржавеючай сталі можна лічыць вырашаным у станоўчым сэнсе, і па яго дакладу камісія Галоўтэрмэту пастанавіла тэрмінова арганізаваць на Златаўстаўскім заводзе вытворчасьць неіржавеючае сталі.

Яшчэ большае значэньне маюць каштоўныя работы акадэміка Іпацьцева, у яго лябараторыі высокіх націскаў пры Ленінградзкім інстытуце прыкладнае хэміі. Пры дапамозе новага мэтаду акадэмік Іпацьцеў дабіўся акісьленьня фосфару, аб чым і прадставіў даклад на паседжаньні прэзыдыуму ВСНГ СССР. Рад акадэмікаў і прафэсароў, што прысутнічалі на гэтым паседжаньні, адзначылі выключна важнае значэньне работ акадэміка Іпацьцева, бо праблема фосфару мае зараз сусьветнае значэньне і, зразумела, надзвычайна важнае значэньне для ўсяе народнае гаспадаркі СССР, і ў прыватнасьці для сельскае гаспадаркі.

ВСНГ СССР, адзначаючы важнасьць работ акадэміка Іпацьцева, пастанавіў даручыць Навукова-тэхнічнаму кіраўніцтву прапрацаваць у тэрміновым парадку пытаньне аб рэарганізацыі лябораторыі акадэміка Іпацьцева ў інстытут высокіх націскаў і аб забесьпячэньні яго сродкамі.

Падрыхтоўка новага фашысцкага пагрому ў Заходняй Беларусі

Пасьля разгрому Грамады і раду вядомых працэсаў, якія канчаліся цяжкімі прысудамі над працоўнымі Заходняй Беларусі, фашысцкі ўрад Пілсудзкага спадзяваўся сіламі тэрору і крывавымі рукамі беларускіх нацыянал-фашыстых задушыць нацыянальна-вызваленчы рух беларускіх працоўных мас.

Роля Луцкевіча і Астроўскага ў плянах польскага фашызму на абшарах Заходняе Беларусі зьяўляецца **недругараднай.** Гэта група беларускіх нацыянал-фашыстых пад прыкрыцьцём радыкальных фраз працае над разлажэньнем нацыянальна-вызваленчае барацьбы мас, над фашызацыяй левых беларускіх нацыянальных арганізацый, над актыўнай ідэалёгічнай падрыхтоўкай вайны супроць Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Праводзячы работу на ўзмацненьні фашысцкай дыктатуры, стаючы на пазыцыях Пілсудчыны, яны вядуць узмоцненую прапаганду «культурніцтва» і «мірнай творчай» работы на карысьць польскага фашызму. Гэтыя лёзунгі нацыянал-фашыстыя ўгрунтоўваюць тэорыяй «адзінага бясклясавага беларускага народу»(!)

Луцкевіч выпускае брашуру, дзе імкнецца паказаць сябе «бацькам» усей вызваленчай барацьбы «беларускага народу», і адначасова, пад маскаю псэўда-лявізны працявае цэлую стройную канцэпцыю беларускага нацыянал-дэмакратызму і зусім **напрыкрытай варожасьці** да Савецкай Беларусі. Адзіным фронтам з усімі беларускімі вгоднікамі разгортваецца шалёная праваканарская работа вакол «Таварыства Беларускай Школы», практыкуюцца паліцэйскія катаваньні, стварацца **правакацыйныя** справы і ўсё а аднэй мэтай—вырваць гэту арганізацыю з-пад уплыву радыкальных элемэнтаў і падпарадкаваць яе фашысцкаму ўплыву. Вядзецца разьюшанае цкаванье кампарты Зах. Беларусі і КП(б)Б.

Гаспадарчыя цяжкасьці, якія перамагаюцца працоўнымі СССР, нацыянал-фашыстыя навялічваюць да разьмераў «глыбокага крызісу», размалёўваюць як «змрок саветаў» і інш.

Нацыянал-дэмакратычныя выступленьні некаторых асоб ў БССР паслужмяныя лёкаі польскага фашызму спрытна падхватваюць і скарыстоўваюць для барацьбы супроць БССР.

Луцкевіч і Астроўскі становяцца **непасрэднымі ўдзельнікамі паліцэйскіх пагромаў,** якія ўчыняюцца ў беларускай гімназіі, яны **актыўна** супрацоўнічаюць в польскай дэфэнзывай і становяцца шаноўнымі гасьцямі ў пана Кіртыкліса. Яны разгортваюць **правакацыйную** работу ў ад

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Мабілізаваць партыйныя масы на барацьбу з праявамі правага ўхілу ў практычнай рабоце

АДМАЎЛЕНЬНЕ ПРАВЫХ АД УСЕБАКОВАЙ ПАДТРЫМКІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПАРТЫЯ РАЗГЛЯДАЕ, ЯК ПЕРАХОД НА ПАЗЫЦЫЮ КУЛАКОЎ

ПРАВЕРКА КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ КП(б)Б ПРАХОДЗІЦЬ ПРЫ ВЯЛІКАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ ПАРТЫЙНЫХ І БЕСПАРТЫЙНЫХ РАБОЧЫХ МАС

Што паказала праверка кіруючых кадраў КП(б)Б у Менску

(Гутарка з старшынёй камісіі ЦКК УсеКП(б) т. Герасімавым)

Перш-на-перш мы павінны падкрэсьліць вялікую актыўнасьць як партыйных, так і беспартыйных мас. Усе куставыя сходы адбываліся пры шматлюднай аўдыторыі, яны прыцягнулі да сябе значную колькасьць рабочых, непасрэдна з заводу.

Але мы павінны тут адзначыць, што асобныя партыйныя ячэйкі не праявілі належнай актыўнасьці ў галіне ўцягненьня беспартыйных рабочых да ўдзелу ў праверцы кіруючых партыйных кадраў.

У часе праверкі кіруючых партыйных кадраў рабочыя падрабязна цікавіліся рэвалюцыйным мінулым кожнага таварыша, што правяраўся, яго дзейнасьцю ў бальшавіцкай партыі да Кастрычніцкай рэвалюцыі, яго ўдзелам у рэвалюцыі і ў грамадзянскай вайне. Рабочыя ўважліва адносіліся да праверкі кожнага паасобку, яны цікавіліся тым, як той ці іншы таварыш праводзіць клясавую лінію партыі і савецкай улады, ці стаіць ён на чале рабочых мас, як ён зьвязаны з рабочымі.

Мы павінны падкрэсьліць, што рабочыя вельмі цікавіліся, ці былі ўхілы ў таварыша, што правяраўся, высьвятлялі яго адносіны да «рабочай апазыцыі», да трацкізму, як ён вядзе барацьбу супроць правага ўхілу. Уважліва адносіліся да праверкі тых таварышоў, у рэвалюцыйным мінулым якіх былі ня зусім ясныя маманты, асабліва, да таварышоў, што належалі ў мінулым да іншых партый: Бунд, эсэры і г. д.

З гэтага мы павінны зрабіць вывад, што як партыйныя, так і беспартыйныя масы, зразумелі мэты і задачы праверкі і дапамагалі камісіі ЦКК УсеКП(б) выявіць клясавы твар кожнага камуністага.

Мы выкрылі выпадак нездаровых адносін да праверкі. Гэта было на куставым сходзе, у якім удзельнічала ячэйка Меншэвэй. Ячэйка Меншэвэй ня здолела даць характарыстыкі члену ЦК т. Ландау, які прымацаваны да гэтай ячэйкі. Мы выявілі, што ячэйка ня зусім здаровая, мы адразу выдзелілі камісію, каб дасканала высьветліць становішча ячэйкі і ўзаемаадносіны яе з беспартыйнымі масамі.

Былі таксама паасобныя выпадкі зьвядзеньня асабістых рахункаў. Праўда, гэта мела месца не на саміх сходах, а ў пісьмовых заявах, што былі перададзены ў кантрольную камісію.

Трэба таксама падкрэсьліць, што на чырвонаармейскіх сходах актыўнасьць значна большая, чымся на рабочых сходах. На сходах у вайсковых лягерах бралі ўдзел каля 2.500 чырвонаармейцаў. Там мы атрымалі шмат запісак, пытаньняў і г. д. Чырвонаармейцы паставрыску аднесьліся да сваіх кіруючых кадраў. Мы наглядалі, што камандзір і начальнік у Чырвонай арміі зьяўляюцца для чырвонаармейцаў ня толькі вайсковым кіраўніком, але і таварышом у штодзённым жыцьці, партыйцам, што дапамагае чырвонаармейцу ў яго палітычным выхаваньні, каб узьняцца на больш высокую ступень у галіне культурнасьці. Гэта таксама можна аднесьці да часьцей ДПУ.

ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ НАСТУПНЫЯ: Мы праверылі 105 кіруючых партыйных таварышоў, з іх ніводзін ня быў выключаны з партыі.

Гэта даказвае, што ў вогуле кіруючы кадр здаровы і здольны праводзіць задачы і генэральную лінію партыі. Мы павінны памятаць мясцовыя ўмовы і сацыяльную структуру Беларусі, у мінулым яна ня была індустрыяльным цэнтрам, але с.-г. і саматужным цэнтрам, індустрыя яшчэ толькі пачынае разьвівацца.

У зьвязку з гэтым бальшавіцкая партыя ў Беларусі пачала арганізоўвацца значна пазьней, чымся ў індустрыяльных цэнтрах. Але, ня гледзячы на ўсе гэтыя спэцыфічныя ўмовы, ў кіруючых партыйных кадрах знаходзіцца лепшае партыйнае ядро. Зараз мы едзем у Віцебск. Мы абралі Віцебск таму, што там ёсьць два вялікія заводы, да якіх прымацаваны 10 членаў ЦК і ЦКК КП(б)Б і частка таварышоў з бюро Віцебскага АК, а 15-га чэрвеня рабочыя гэтых заводаў ідуць у адпачынак. Таму мы зараз едзем туды, каб правесьці праверку пры ўдзеле шырокіх рабочых мас. У Гомелі мы будзем 20 або 21-га чэрвеня.

РУБІНШТЭЙН.

Хроніка праверкі

Праверка таварышоў, вылучаных у праверачныя камісіі

11-га чэрвеня ў Доме Чырвонай арміі адбыўся другі куставы партсход, на якім былі праверены 5 таварышоў, вылучаных у склад праверачных камісій. Праверку прайшлі т. т. Беласкокаў, Мызянкоў, Рамашоў, Шнек, Шумакоў.

На сходзе прысутнічалі партячэйкі штадзіву №-скай кавалерыйскай дывізіі, эскадрону сувязі і конардыву. Праверку праводзіла камісія ў складзе т. т. Суднова, Шаўцова і Штэймана.

***

Пазаўчора ў клюбе імя Карла Маркса адбыўся адкрыты куставы партсход, на якім прысутнічалі камуністы і беспартыйныя рабочыя фабрыкі «Меншэвэй», 1-й друкарні, шпалернай фабрыкі і Наркамзему. На сходзе былі праверены таварышы Бягун, Розман, Сьпірыдонаў, Адлерштэйн, Мучнік, Раманчук, Любамірскі, Жардзецкі, Скаўронак, Гарэгляд, якія вылучаны прэзыдыумам Мен. АКК у склад праверкомаў.

Праверку праводзіла камісія ў складзе т. т. Дамброўскага, Новікава, Самойлава.

На куставым сходзе ячэек у клюбе будаўнікоў

Пазаўчора ў клюбе будаўнікоў адбыўся адкрыты куставы сход ячэек Белдзяржбуду, заводу «Беларусь», акрэа і менскай пажарнай каманды, на якім камісія ЦКК УсеКП(б) правярала таварышоў—членаў кіруючых органаў КП(б)Б. Праверку праходзілі т. т. Бэйлін, Розін, Жуковіч, Шукевіч-Трацьцякоў, Каплан, Тамашэўскі.

Сход вельмі актыўна ўдзельнічаў у рабоце праверачнай камісіі.

У Віцебск выехала камісія ЦКК УсеКП(б)

Учора ў Віцебск прыехала камісія ЦКК Усе КП(б) для праверкі членаў і кандыдатаў ЦК і ЦКК КП(б), што працуюць у Віцебску і акрузе, і членаў бюро АК і прэзыдыуму АКК КП(б)Б.

Праверка пачынаецца 14-га чэрвеня. Сьпісы таварышоў, якія падлягаюць праверцы, апублікаваны ў акруговай газэце «Заря Запада».

Праверка будзе праводзіцца на адкрытых куставых партсходах вытворчых калектываў і ячэек Віцебскай арганізацыі. Акруговы камітэт КП(б)Б зьвярнуўся да ўсіх членаў партыі, да ўсіх рабочых і работніц Віцебшчыны прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні праверкі.

Постановы XVI канфэрэнцыі —у масы

Заслухаўшы даклад аб выніках XVI партканфэрэнцыі, райпартсход Касьцюковіцкай арганізацыі поўнасьцю далучаецца да ўсіх пастаноў канфэрэнцыі і лічыць, што ўсе пытаньні, якія вырашаліся на 16 партканфэрэнцыі, былі накіраваны па шляху вырашэньня ў строга-вытрыманым ленінскім напрамку далейшай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі, далейшага будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Уязтая лінія ленінскага ЦК УсеКП(б) у напрамку выкананьня дырэктыў 15-га партзьезду — правільная. Райпартсход жорстка асуджвае правых ухіляністых і іх групоўку, якія скаціліся і пайшлі па лініі найменшага супроціўленьня за дробнабуржуазнай стыхіяй і ня бачаць нашых дасягненьняў, капітулююць перад труднасьцямі, не даацэньваюць клясавай барацьбы. Райпартсход запэўнівае, што пастаўленыя задачы 16 партканфэрэнцыі будуць строга праводзіцца ў жыцьцё ў штодзённай рабоце ўсёй райпартарганізацыяй, адначасова райпартсход ставіць, як адну з галоўнейшых задач, што ні адзін камуністы, які працае на сялянскай гаспадарцы, не павінен быць па-за калтасам.

Райпартсход ставіць лёзунг: усе камуністы, што працуюць на сельскай гаспадарцы—у камуны і калтасы!

Няхай жыве адзінства і аднадушнасьць УсеКП(б) і яе Ленінскі ЦК.

Няхай жыве Камінтэрн—штаб сусьветнае пралетарскае рэвалюцыі!

***

Заслухаўшы даклад аб выніках 16-й партканфэрэнцыі, агульны сход Шклоўскай раённай арганізацыі КП(б)Б далкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы канфэрэнцыі і далучаецца да іх.

Сход рашуча асуджае апартуністычную палітыку правых і прымірэнцаў, якія скажаюць правільную бальшавіцкую ленінскую лінію партыі.

Агульны сход абавязвае ўсе партячэйкі раёну прапрацаваць пастановы 16 партканфэрэнцыі. Сход прапануе ўсім членам і кандыдатам партыі папулярызаваць пастановы сярод рабочых, работніц, а таксама сярод батрацтва, вясковай беднаты і серадняку.

***

(ГРЭСКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ)

На апошнім райпартсходзе нашай раённай арганізацыі быў абмеркаваны даклад аб выніках XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі. Па дакладу выказаўся рад таварышоў. Усе выступаўшыя ў сваіх прамовах завастралі ўвагу сходу на барацьбе супроць правага ўхілу і прымірэнцтва, выкрываючы факты скажэньняў клясавай лініі ў практычнай рабоце асобных камуністых.

— Калі раённая партарганізацыя — кажа адзін з прамоўцаў—рашуча паставіла пытаньне аб калектывізацыі, аб яе практычным разгортваньні, то з боку асобных камуністых выявіліся недапушчальныя адносіны да выкананьня дырэктыў партыі. Так, член Шышыцкай партячэйкі тав. Нямковіч катэгарычна адмовіўся ўступіць у калгас. Ён мае такую гаспадарку, у якой трымае трое коняй, дзевяць кароў і інш., што ў поўнай меры яго характарызуе, як камуністага, які свае ўласныя інтарэсы ставіць вышэй дырэктыў партыі, як чалавека, які, будучы ў Чырвонай арміі, выпадкова трапіў у партыю.

Або калі ўзяць кандыдата партыі тав. Зыбойла, старшыню аднаго з сельсаветаў. І наглядзець, як ён абараняе інтарэсы беднаты, то ўбачым, што тут ня ўсё добра. Лес, адпушчаны ў крэдыт для беднаты, нейкім парадкам сельсавет перадаў заможнікам.

Сход рашуча асудзіў правы ўхіл і прымірэнцтва, даў адпор тым, што ня верацъ у сілы пралетарыяту, што ня хочуць выконваць дырэктыў партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Сход у адзагалосна прынятай рэзалюцыі заявіў: Толькі дзякуючы правільнай ленінскай лініі партыі, яе бальшавіцкага ЦК і няўхільнаму выкананьню пастаноў XV зьезду УсеКП(б) бязупынна расьце сацыялістычны сэктар у народнай гаспадарцы. Грэская райпартарганізацыя цьвёрда стаіць на ленінскім шляху і прыложыць усе сілы, каб як мага паўней у практычнай рабоце ажыцьцявіць пастановы XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі.

М. САКАЛОЎСКІ.

Выкрывайце скажэньні партыйнай лініі ў практычнай рабоце

Агонь барацьбы накіраваць на канкрэтных насіцеляў правага ўхілу

Партыя ўзяла курс на рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты краіны.

Узмацненьне тэмпу індустрыялізацыі ідзе побач з выціскаьнем прыватнага капіталу з нашай прамысловасьці. Рост калгасаў і саўгасаў непасрэдна б'е па інтарэсах кулацтва. Нэпман і кулак добраахвотна не адыходзяць. Яны аказваюць шалёнае супраціўленьне разгортваньню нашага сацыялістычнага будаўніцтва. **Вось чаму лінія партыі, накіраваная на фарсаванае наступленьне на нэпмана і кулака, зьяўляецца адзіна правільнай і поўнасьцю забясьпечвае ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну.**

Правыя апартуністы і прымірэнцы выступілі супроць гэтай лініі. І гэта ня дзіўна, зьяўляючыся па сутнасьці ідэолёгамі кулацтва і дробнай буржуазіі, яны не маглі выступаць за наступленьне на капіталістычныя элемэнты. Правыя і прымірэнцы супроць клясавай барацьбы, яны за «клясавы мір», за «мірнае ўрастаньне кулака ў сацыялізм». Партыя выкрыла анты-ленінскую сутнасьць гэтых лёзунгаў. Партыйныя масы асудзілі правых і прымірэнцаў, што капітулююць перад дробна-буржуазнай стыхіяй, якія заклікаюць да мірнага суажыцьця з кулаком. Але ці можам мы на дасягнутым супакоіцца? Ці значыць гэта, што мы павінны аслабіць нашу барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі? Вязумоўна, не. Факты з месц гавораць нам аб тым, што асобныя члены партыйных арганізацый яшчэ не зразумелі сутнасьці «тэорыі» правых і прымірэнцаў, ня вылучылі карэньняў правага ўхілу.

Факты гавораць аб тым, што правыя элемэнты ў радох нашых раённых вясковых арганізацый пачынаюць адкрыта агітаваць супроць лініі партыі, супроць разгорнутага наступленьня на кулака.

Партыец Чачура (Халапэніцкая ячэйка КП(б)Б, Менская акруга) на сходзе ячэйкі заявіў: «Мы павінны дазволіць кулаку свабодна разьвіваць сваю гаспадарку». Але гэта яшчэ ня ўсё. Чачура скінуў маску і выказаўся да канца.

«Кулацтву трэба даць ільготы па с.-г. падатку». Што гэта значыць?

Дазволіць кулаку ўмацаваць і разьвіваць сваю гаспадарку, даць яму падатковыя ільготы—гэта значыць—затармазіць тэмп сацыялістычнага будаўніцтва, г. зн. вярнуцца назад да капіталізму, адмовіцца ад будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Такі шлях прапануе Чачура. Выступленьне камуністага Чачуры ня проста капітуляцыя перед кулаком, ня толькі панічнае адступленьне перад труднасьцямі нашага росту. Не. «Камуністыя» надобнага тыпу ня проста капітулююць перад кулаком, а любяць яго, над абаронай партбілету агітуюць за інтарэсы кулацтва.

Але не заўсёды апартуністыя і прымірэнцы скідаюць маскі і адкрыта праваедуюць аб «мірным урастаньні кулака ў сацыялізм». Характэрная рыса ўсякага апартуністага—ня выказваць проста сваіх поглядаў. Правыя і прымірэнцы ўмела маскуюць свае пчырыя палітычныя погляды слоўнай мішурой. Член партыі Дзянісевіч (Кашчынская ячэйка КП(б)Б, Меншчына) прытрымліваецца гэтага выпрабаванага мэтаду апартуністых. Дзянісевічу не падабаецца лёзунг партыі: «Кляса супроць клясы», не падабаецца лінія партыі—наступленьне на кулацтва. «Ня трэба спрэчак паміж сялянствам»—вось дэвіз Дзянісевіча, за які ён ня раз агітаваў на сходах ячэйкі. Для Дзянісевіча няма кулака і батрака, няма беднаты і серадняцтва. Для Дзянісевіча ёсьць «сялянства» адно цэлае. Дзеля чаго ўсе гэтыя размовы аб клясавай барацьбе, аб разгорнутым сацыялістычным наступленьні. Пакінеце кулака. Ня трэба спрэчак паміж сялянствам. Дзянісевічы не прызнаюць клясавай барацьбы, яны хочуць жыць спакойна і мірна, не чапаць кулака.

Калі ў нашых радох яшчэ захаваліся такія элемэнты, якія прапануюць гэты шлях, дык мы з усёй рашучасьцю павінны паставіць перад імі пытаньне:

— Або быць у партыі і прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, цьвёрда і няўхільна праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі, змагацца з апартуністымі і прымірэнцамі, выконваць клясавыя задачы партыі, змагацца з кулаком, або выйсьці з партыі.

Г. Т.

У пятніцу, 14-га чэрвеня г. г., а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б

адбудзецца

пасяджэньне камісіі па адборы кандыдатаў у вячэрні камвуз

Усім сакратарам або апоргам ячэек з усімі кандыдатамі зьявіцца ў РК да паказанага часу.

Апошні тэрмін здачы ў РК анкет на жадаючых вучыцца ў вячэрнім камвузе—чацьвер, 13-га чэрвеня г. г.

Факты, з якіх напрошваюцца вывады

(Мазырская акруга)

Калі ў асноўным лёзунг партыі аб разгортваньні самакрытыкі ў асноўным знайшоў сваё канкрэтнае адлюстраваньне ва ўсёй сыстэме работы, дык побач з гэтым яшчэ наглядаюцца выпадкі «глупэньня» самакрытыкі, нядбайных адносін да каштоўных прапаноў рабочых.

Не гаворачы ўжо аб тым, што некаторыя з асобных партыйцаў падышлі фармальна да растлумачэньня шырокім масам лёзунгу самакрытыкі, мы можам канстатаваць рад момантаў недапушчальных адносін з іх боку да тых, якія крытыкуюць адмоўныя зьявішчы ў рабоце тае ці іншае установы.

Так, старшыня Людзяневіцкага спажывецкага таварыства (Жыткавіцкі раён), член партыі Квяткоўскі звольніў з касады работніка каапэратыву за тое, што ён выкрыў злачынствы другога працаўніка Пянькоўскага. Загадчык гаспадаркай Жыткавіцкай больніцы за явіў супрацоўнікам «пачнеце крытыкаваць, хутка будзеце выкінуты на вуліцу» (на жаль, ён яшчэ і дагэтуль знаходзіцца на гэтай рабоце). Ці вось, сакратар Галоўчыцкай партячэйкі (Нараўлянскі раён) хацеў аб адным члене партыі паставіць «пытаньне» на бюро ячэйкі толькі таму, што ён на адкрытым партсходзе выказаўся за чыстку вытворчых партячэек (?).

У Капаткевіцкім раёне ў радзе ўстаноў месяцамі ляжаць бяз руху заявы і скаргі сялян. Калі рабочы Кірсанаў (Капаткевічы) дрэнна адносіўся да другога рабочага-яўрэя, а апошні падаў заяву, дык ні партячэйка, ні прафарганізацыя на гэту заяву не зьвярнулі ўвагі, і толькі тады, калі Кірсанаў параніў рабочага-яўрэя, узяліся за гэтую справу.

Паданыя прыклады гавораць самі за сябе. З іх трэба ячэйкам зрабіць адпаведныя вывады.

Б. Ш.

Ад хістаньняў да адкрытай дапамогі клясаваму ворагу

Саюз „камуніста", кулака і дыякана

Вясковыя камуністыя заклікаць да выкананьня грандыёзных задач па сацыялістычным перабудаваньні сельскае гаспадаркі. Вясковыя камуністыя закліканы змагацца з кулаком, ажыцьцявіць генэральную лінію ў адносінах вёскі. Вясковыя камуністыя--арганізатары калгасаў і вытворчых аб'яднаньняў. Толькі з гэтага пункту погляду трэба ацэньваць работу кожнага асобнага камуністага.

Зараз мы можам сьмела канстатаваць буйнейшыя дасягненьні на фронце калектывізацыі. Асноўная маса вясковых камуністых усьвядоміла важнасьць калектывізацыі для нашага будаўніцтва і прымае актыўны ўдзел у арганізацыі калектываў.

Але, адзначаючы дасягненьні, мы ня можам прайсьці міма аднаго сур'ёзнага і трывожнага факту. Правыя элемэнты ў радох нашых вясковых арганізацый пачынаюць усё актыўней і актыўней выступаць супроць калектывізацыі. Кулакі і падкулачнікі, што пралезьлі ў партыю, правыя і прымірэнцы ў адзін голас агітуюць супроць арганізацыі калгасаў, зрываюць правядзеньне зямляўпарадкаваньня і г. д. Часам адкрытае выступленьне супроць калгаснага будаўніцтва ўдала маскуецца прыгожымі фразамі, агульнымі разважаньнямі. Але сэнс гэтых выступленьняў ясны: калгасаў арганізоўваць ня трэба. Вельмі яскравым і характэрным прыкладам да гэтых слоў можа служыць наступны факт. На раённым сходзе Халопэніцкай арганізацыі КП(б)Б выступіў партыец Жук. Зьмест яго выступленьня прыблізна наступны:

Камуністыя, якія маюць індывідуальныя гаспадаркі павінны абагачацца. Жыць бедна—цяжка, трэба жыць багата. Аб тым, што камуністыя павінны ісьці ў калгасы, Жук не сказаў ні слова. У выніку ўсё выступленьне заключалася ў агітацыі за гаспадарчае абрастаньне, за росквіт індывідуальнае гаспадаркі, за ідэалы кулацтва.

У гэтым годзе ў вёсцы Верхмень (Смалявіцкі раён, Менская акруга) праводзілася зямляўпарадкаваньне. Бядняцка-серадняцкая частка вёскі аднадушна парашыла перайсьці на калектыўнае зямлякарыстаньне. Але беднаце прышлося вытрымаць вялізную барацьбу з кулакамі. У гэты час у вёсцы знаходзіўся член партыі Чыстоў. Ён заместа таго, каб дапамагчы беднаце, весьці барацьбу за інтарэсы беднаты, скарыстаў усе магчымасьці для таго, каб сарваць зямляўпарадкаваньне і калектывізацыю. «Камуністы»—падкулачнік выступіў у ролі абаронцы кулацкіх інтарэсаў. Чыстоў даваў практычныя парады мясцовым кулаком, як перашкаджаць правядзеньню зямляўпарадкаваньня і арганізацыі калгасу. Да гэтай работы Чыстоў прыцягваў мясцовага дыякана. Яная думка стварылася ў верхменскай беднаты наогул аб камуністых, калі яна ўбачыла, што член партыі выступае супроць яе, супроць калгасу і сябруе з кулацтвам.

Там, дзе камуністыя зьвязаны з клясавым ворагам, з кулакамі і духавенствам, там нямінуча квітнеюць праваўхіляцкія настроі, прымірэнцтва і г. д. Ад простай сымпатыі да правага ўхілу, ад простых апартуністых хістаньняў да абароны клясавага ворага—вельмі невялікая адлегласьць. Верхменскае кулацтва сарвала зямляўпарадкаваньне. Прычым характар гэтага адкрытага выступленьня быў яўна-антысавецкі. Груба па кулакоў была арыштавана. І тады былы сакратар Верхменскай партыйнай ячэйкі тав. Шэршан пачаў клапаціцца, каб вызваліць кулакоў. А тое, што яны сарвалі зямляўпарадкаваньне, сарвалі арганізацыю калгасу, зрабілі адкрытае, антысавецкае выступленьне, гэта сакратара зусім ня цікавіла. На першым пляне было жаданьне дагадзіць клясаваму ворагу.

***

Паданыя факты гавораць аб тым, што падкулачнікі, якія вынадкова пралезьлі ў партыю, прыкрываючыся партыйным білетам, пачынаюць ня толькі ідэёва агітаваць супроць калектывізацыі, але і зрываць арганізацыю калгасаў. Яны замест абароны інтарэсаў беднаты і серадняцтва абараняюць інтарэсы нашых клясавых ворагаў. Трубадуры кулацтва заварушыліся. А на мясцох, трэба прызнацца, мы часамі несваячасова рэагуем на гэта, слаба змагаемся з канкрэтнымі праяўленьнямі правага ўхілу і прымірэнцтва.

Ю. К.

Усебеларуская канфэрэнцыя камсамолу

Камсамол Беларусі— непасрэдны памочнік КП(б)Б

Даклад т. Галавача аб рабоце ЦК ЛКСМБ

Уся работа камсамолу Беларусі была накіравана на выкананьне тых задач, якія ставіла перад ім партыя. Работа ўсёй арганізацыі камсамолу была накіравана на правядзеньне генэральнай лініі партыі па індустрыялізацыі краіны, па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Гэтая работа праходзіла ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах некаторых гаспадарчых труднасьцяй.

Наступленьне на клясавага ворага выклікае з яго боку ўпартае супраціўленьне. Клясавы вораг ня хоча здаць сваіх пазыцый.

Вось чаму наша асноўная задача—згуртаваць рады камсамолу і масы беспартыйнай працоўнай моладзі наўкола генэральнай лініі партыі, мабілізаваць моладзь на барацьбу з рознымі ўхіламі ад правільнай ленінскай лініі партыі.

Камсамол Беларусі з усёй рашучасьцю змагаўся з тымі, хто рабіў спробы працягнуць сваю контр-рэвалюцыйную ідэалёгію трацкізму ў камсамольскія рады.

З тэй-жа рашучасьцю і энэргіяй выступіла наша арганізацыя супроць правага, яўна-апартуністычнага ўхілу і прымірэнцтва да яго. Камсамол мабілізаваў усю рабочую моладзь на барацьбу са скажэньнямі лініі партыі ў практычнай рабоце. Гэта барацьба будзе стаяць у цэнтры ўвагі і ў далейшай нашай рабоце.

Мы побач з гэтым павінны адзначыць, што ня ўсе яшчэ камсамольцы добра зразумелі сутнасьць правага ўхілу. Наша задача заключаецца ў тым, каб шырока растлумачыць масам камсамольцаў і працоўнай моладзі сутнасьць правага ўхілу і прымірэнцтва да яго.

У ПЕРШЫЯ РАДЫ БУДАЎНІКОЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Камсамол разгарнуў вялікую работу па ўцягненьні рабочай моладзі ў работу на ўздыме нашай прамысловасьці. Актыўнасьць камсамольцаў узрасла. У вытворчых камісіях, на вытворчых нарадах камсамольцы прымаюць актыўны ўдзел. Сацыялістычнае спаборніцтва, якое праводзіцца зараз, праходзіць пры непасрэдным удзеле камсамольскіх ячэек. Амаль усюды існуюць ударныя брыгады моладзі, камсамольцы паказваюць прыклады лепшых адносін да вытворчасьці, зьяўляюцца пачынальнікамі ў добраахвотным зьніжэньні расцэнак і г. д.

Трэба і надалей забясьпечыць актыўны ўдзел рабочай моладзі ў гаспадарчым будаўніцтве, забясьпечыць і надалей пярэдзінства камсамолу ў справе сацыялістычнага спаборніцтва. Камсамольцы павінны быць у першых радох будаўнікоў сацыялістычнай прамысловасьці.

У ПАХОДЗЕ ЗА ЎРАДЖАЙ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

Надзвычайна вялікую работу правёў камсамол у падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі. Паход за ўраджай, каб па зборы попелу далі добрыя вынікі. У адным г. Менску сабрана больш 5.000 пудоў попелу, па другіх гарадох колькасьць сабранага попелу вымяраецца таксама тысячамі пудоў. У гэтым нам шмат дапамагла піянэрарганізацыя.

Камсамольцы арганізавалі рад калгасаў, камун і с.-г. таварыстваў. Але і на фронце калектывізацыі мы маем рад недахватаў.

Ёсьць яшчэ такія камсамольцы, якія на словах агітуюць за калектыў, а на справе самі зрываюць арганізацыю калгасаў, самі адмаўляюцца ўступіць у камуну. Такім камсамольцам, зразумела ня месца ў камсамоле. Нам патрэбна не пустая агітацыя, а сапраўдная дзеславая практычная работа па калектывізацыі.

Трэба абвясьціць спаборніцтва па калектывізацыі паміж ячэйкамі, раённымі арганізацыямі. Трэба гэтай найважнейшай справе аддаць яшчэ больш увагі чым мы ёй аддавалі да гэтага часу.

ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ З АНТЫСЭМІТЫЗМАМ І ШАВІНІЗМАМ

Шмат увагі адвёў дакладчык пытаньню барацьбы з антысэмітызмам і шавінізмам у камсамоле. За апошні час мы мелі яскравыя праявы шавінізму (тэатральная дыскусія, ліст пісьменьнікаў і інш.).

Мы наглядаем таксама праявы вялікарасійскага шавінізму з боку часткі прафэсуры беларускіх ВНУ і настаўнікаў школ.

З гэтымі зьявішчамі камсамолу яшчэ прыдзецца рашуча змагацца. Мы павінны абвясьціць бязьлітасную барацьбу конт-рэвалюцыі, якая хаваецца пад маскай антысэмітызму і розных колераў шавінізму.

РОСТ І СКЛАД АРГАНІЗАЦЫІ

За апошнія 2 гады рады камсамолу Беларусі значна вырасьлі. На 1-е красавіка 1927 г. ЛКСМБ налічваў у сваіх радох 44 тысячы чалавек, а на 1-е красавіка бягучага году—70.480 чалавек.

Склад арганізацыі: рабочых—23 тысячы чалавек (32,7 проц.), батракоў—6.146 (8,7 проц.), серадняко-сялян—8.897 (12,7 проц.), беднякоў—25.428 (36 проц.), саматужнікаў—3 тысячы чалавек (4,3 проц.), іншых 3.960 ч. (5,6 проц.).

Процант рабочых у складзе ЛКСМБ за гэты час зьменшыўся. У той час, як у 1927 г. рабочыя складалі 35,5 проц арганізацыі, яны зараз складаюць толькі 32,7 проц. арганізацыі. Гэта гаворыць аб тым, што ЛКСМБ трэба накіраваць усю увагу на вярбоўку ў арганізацыю маладых рабочых вытворчасьці. Тое самае і ў адносінах да батракоў. Процант апошніх таксама невялікі. Нельга не адзначыць і слабога вылучэньня дзяўчат на актыўную камсамольскую работу. З 2.196 сакратароў ячэек, дзяўчаты—сакратары складаюць толькі 9,5 проц.

Па Савецкім Саюзе

Падарунак ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 11. ЦК УсеКП(б) атрымаў з Бучына, Брансцкае губ. наступную тэлеграму:

«Прымеце падарунак. Арганізавалі калгас на надзельнай зямлі ў 300 гэктараў, у колькасьці 250 едакоў. Зараз выяжджаем у поле. Няхай жыве ленінскі ЦК. Урачысты сход. 150 грамадзян».

Адкрыцьце новага водаправоду ў Растове н-Д

РАСТОЎ н/Д, 11. Адбылося ўрачыстае адкрыцьцё новага водаправоду. Стары водаправод існаваў каля 60 год. Забруджанасьць і спрацаванасьць яго фільтраў была прычынаю вялікіх эпідэмій брушнога тыфусу. Пабудова водаправоду каштавала 3.600.000 рублёў. З поваду адкрыцьця водаправоду атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад ЦВК СССР і Наркамату ўнутраных спраў.

1.000 камуністых накіравана ў ВТНУ

МАСКВА, 11. Па прыкладу мінулага году, в ВТНУ накіравана 1.000 камуністых, з іх 831 чал. у ВТНУ РСФСР Іспыты будуць праводзіцца з 10-га да 15-га жніўня. Ад іспытаў аслабаняюцца асобы, атрымаўшыя закончаную сярэднюю асьвету (рабфак, тэхнікум і школа 2-й ступені на працягу апошніх трох год). Прынятыя ў лік «1.000» павінны быць забясьпечаны пэнсыяй да 1-го кастрычніка па месцу іх службы.

Сутычка двух параходаў

ХЭРСОН, 11. Сёньня а 2-й гадз. ўночы каля Кахоткі на поўным ходзе наляцелі адзін на другі два пасажырскіх параходы—«Энгельс» і «Прафінтэрн», што курсуюць паміж Хэрсонам і Запарожжам. Абодвы параходы ўшкоджаны. Ахвяр няма. На месца аварыі выехала спэцыяльная камісія.

Чыстка партыі і масавая работа на прадпрыемстве

Чыстка партыі павінна ўмацаваць партыю, як авангард клясы, як перадавую частку пралетарыяту. Разам з тым, чыстка павінна спрыяць умацаваньню сувязяй партыі з масамі. У тым-жа артыкуле «Чыстка партыі» Ленін пісаў:

«Чысьціць партыю, лічыцца з указаньнямі беспартыйных працоўных, справа вялікая. Яна дае нам сур'ёзныя вышкі. Яна зробіць партыю значна больш моцным авангардам клясы, чым раней, зробіць яе авангардам, больш моцна зьвязаным з клясай, больш адольным весьці яе да перамогі сярод масы труднасьцяй і небясьпек».

Сувязь з шырокімі рабочымі масамі ў працэсе чысткі партыя павінна замацоўваць перш за ўсё праз рабочы актыў. «Апіраючыся ў сваёй рабоце на гэты беспартыйны рабочы актыў, усярмена спрыяючы яго далейшаму папаўненьню, а таксама яго культурнаму і палітычнаму росту і чэрпаючы з яго новыя папаўненьні ў свае арганізацыі, партыя робіць важнейшую справу для ўсебаковага ўмацаваньня сваіх сувязяй з масамі рабочае клясы» (Лістападаўскі пленум ЦК).

Справе прыцягненьня беспартыйнага рабочага актыву да праверкі партыйных радоў парт'ячэйкі на прадпрыемствах абавязаны ўдзяляць асаблівую увагу. І тут задача не абмяжоўваецца тым, каб перадавыя рабочыя-актывісты дапамагалі чысьціць членаў ячэйкі дапага прадпрыемства. Трэба дабіцца таго, каб вытворчыя ячэйкі, апіраючыся на беспартыйны рабочы актыў, дапамаглі партыі правяраць камуністых, што працуюць у гаспадарчых органах савецкіх установах і г. д. Партыя ставіць сваёй задачай—выгнаць са сваіх радоў бюракратаў, тых, што прымазаліся «перарадзіліся», не праводзяць выразнай клясавай лініі. Знайсьці гэтыя элемэнты сярод тых 460 тысяч камуністых, якія працуюць у дзяржапараце, справа нялёгкая. І тут партыі на дапамогу павінны прыйсьці партыйцы ад варштату і перадавыя беспартыйныя рабочыя. Вось чаму **важнейшай задачай вытворчых ячэек зьяўляецца задача дапамагчы партыі ў чыстцы камуністых, што працуюць у розных установах.**

Як гэта зрабіць?—Практыка дасьць нам у гэтым напрамку рад шляхоў, мы-ж адзначым толькі некаторыя. У рабочай масе вядомы тыя ўстановы і асобы, якія, асабліва, «славяцца» сваім бюракратызмам, сваёй няўважлівасьцю да патрэб працоўных. Трэба, каб ячэйкі на прадпрыемстве і праверачныя камісіі шляхам гутарак з рабочымі-партыйцамі, і асабліва беспартыйнымі, «намацалі», выявілі гэтыя ўстановы і асобы, паведаміўшы потым аб іх адпаведныя партыйныя інстанцыі. Трэба асабліва ўважліва перагаварыць з тымі рабочымі, якія, працуючы ў сэкцыях саветаў, у абсьледваньнях РСІ, у якасьці дэпутатаў саветаў, маюць найбольшую магчымасьць зносіцца з нашым савецкім апаратам, а, значыцца, ведаюць і канкрэтных насіцеляў бюракратычнага зла. Трэба зьвязацца з ячэйкамі тых савецкіх устаноў, якія бліжэй усяго стаяць да прадпрыемства (напрыклад, трэст і інш.), з тым, каб пасылаць на сходы па праверцы гэтых ячэек спэцыяльныя дэлегаціі з партыйных і беспартыйных рабочых для ўдзелу ў чыстцы. Трэба, нарэшце, арганізаваць прыём заяў ад рабочых з указаньнем камуністых, працаўнікоў дзяржапарату, якія, на думцы рабочых, не заслугоўваюць выс

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

Пад агонь самакрытыкі нашу барацьбу з бюракратызмам!

Яшчэ мала рабочых актывістых прымаюць удзел у рабоце РСІ

Бюракратызм і цеганіну пераможам толькі моцным націскам шырокіх працоўных мас

Рабочыя засядацелі, „лёгкая кавалерыя", добраахвотнікі—усе на дапамогу РСІ і бюро скаргаў!

(Кароткія вынікі працы аб'яднанага бюро скаргаў НК РСІ БССР)

13/VI-29.

Апошні год зьяўляецца перным годам, у які самакрытыка вьнізу стала адным з лепшых спосабаў прыцягненьня шырокіх працоўных мас да зьніпчэньня недахопаў апарату хаця, бязумоўна, самакрытыка яшчэ ў належнай ступені не разгарнулася.

Калі праглядзець паступленьне скаргаў у цэнтр. бюро скаргаў РСІ, то апошні год дае значнае павышэньне паступленьня пісьмовых скаргаў, што, бязумоўна, падкрэсьлівае, што актыўнасьць працоўных мас і рэагаваньне на недахопы працы ўзрасьлі, за тэрмін з 3-IV 27 г. па 1-VI 28 г. паступіла 1.504 заявы, а з 1-VI 28 г. па 1-VI 29 г.—4.649 або 300 проц.

Па сваім характары скаргі падзяляюцца: бюракратызм і цяганіна—508 ці 18 проц., парушэньне прац. законадаўства—643 ці 12 проц., сель.-гасп. падатак—247 ці 4,5 проц., зямельныя і лясныя—504 ці 10,5 проц., злоўжываньні—452 ці 10 проц., пратэкцыянізм—321 ці 7 проц., штрафы—120 ці 3 проц., безгаспадарчасьць 52 ці 1 проц., кватэрныя—221 ці 5 проц., беспрацоўе—225 ці 5 проц., незаконныя дзеяньні—257 ці 6,5 проц., прасьледваньні—17 ці 0,6 процантаў і розных 524 ці 11 проц.

Лічбы паказваюць, што найбольшы процант падае на бюракратызм і цеганіну, парушэньне праў працоўных, зямельныя, лясныя і злоўжываньні. Колькасьць іх узрасла ў параўнаньні з мінулым годам ад 80 да 100 проц.; пратэкцыянізм у мінулым годзе—111 за год і 203 за першае паўгодзьдзе—рост на 210 проц.; парушэньне працоўнага законадаўства—396 за мінулы год і 403 за першае паўгодзьдзе—198 проц., бюракратызм і цеганіна адначасна 568 і 469—165 проц. Гэтыя лічбы ставяць перад намі задачу як па ўзмацненьні барацьбы, так і па вывучэньні належнымі органамі. Пытаньне парушэньня працоўнага законадаўства патрабуе большай увагі прафсаюзаў і органаў НКПрацы. Заўважаецца тэндэнцыя, што скаргі па пытаньнях працоўнага законадаўства ідуць міма прафсаюзаў і органаў НКПрацы ў бюро скаргаў.

Па сацыяльным становішчы скаргаўшчыкі падзяляюцца:

рабочых—874 ці 19 проц., сялян—1.448 ці 33 проц., чырвонаармейцаў—136 ці 2 проц., служачых—737 ці 16 процантаў, беспрацоўных—321 ці 7 проц., саматужнікі—290 ці 3 проц., непрацоўны элемэнт—109 ці 1,7 проц., іншыя, якіх нельга вызначыць,—814 ці 18 проц. і дзяржаўныя органы—171 ці 3 проц. Такім чынам, па сацыяльным становішчы больш усяго скардзяцца рабочыя і сяляне—68 проц., што сьведчыць аб не даволі чулым і ўважлівым падыходзе з боку раду ўстаноў да запатрабаваньняў працоўнага насельніцтва.

Большая колькасьць скаргаў падае па зямельныя і лясныя органы—13 процантаў, РВК і сельсаветы—12 проц., асьвета, ахова здароўя—11 проц., гаспадарчыя—11 проц. Гэта гаворыць за тое, што вывучэньне і ўзмацненьне працы савецкага апарату на вёсцы патрабуе большай увагі нашай грамадзкасьці і органаў РСІ.

З усіх паступіўшых скаргаў у цэнтральнае бюро скаргаў пры НК РСІ Бел. вырашана 2.759 ці 59 проц., ня вырашана—1.890 ці 41 проц. (што тлумачыцца вялікай перагрузкай працаўнікоў бюро скаргаў і немагчымасьцю правяраць выкананьне пастаноў бюро скаргаў установамі).

Тэрмін вырашэньня скаргаў ад 1-го тыдню да 2-х—1.630 ці 58 проц., 1 месяц—515 ці 19 проц., 2 месяцы—16 процантаў, 3 месяцы—168 ці 5,8 проц., 6 месяцаў—42, ці 1,2 проц.

Падагульваючы тэрміны вырашэньня, трэба сказаць, што за апошні год ёсьць дасягненьні ў справе паскарэньня вырашэньня скаргаў: у 26-27 г. за 2 тыдні было вырашана 28,5 проц., у 28-29 годзе—58 проц. Аднак, і на сёнешні дзень яшчэ ёсьць значны недахват у справе хуткасьці вырашэньня скаргаў, з прычыны загружанасьці і малой колькасьці апарату бюро скаргаў, а таксама неабходнасьці адсылкі скаргаў у акругі на месца для расьсьледваньня і несвачасовасьці выкананьня даручэньняў месцамі, даных бюро скаргаў.

За год пасяджэньняў цэнтральнага бюро скаргаў было 43, разгледжана пытаньняў 466, удзельнічала рабочых засядацеляў 117; па гэтых справах на высьвятленьні і расьсьледваньні прынялі ўдзел лёгкая кавалерыя і добраахвотнікі—268. З гэтых разгледжаных пытаньняў перадана ў суд—27, калегіі РСІ—14, вынесена вымоў—95, пастаўлена на від—52, зьнята з работы—54, наложана адміністр. спагнаньняў—50. Такім чынам, па 67,7 проц. усіх разгледжаных спраў прынята тая ці іншая мера спагнаньня і ў 16,7 проц. выпадках вінаватыя зьняты з працы.

Рабочыя засядацелі прымалі актыўны ўдзел у вырашэньні спраў, таксама і «лёгкія кавалерыстыя» (40 проц. усіх вынесеных спраў). З існуючых 36 атрадаў лёткай кавалерыі з агульнай колькасьцю ў 432 чал., прынялі ўдзел у рабоце Б. С. толькі 136 чал. або 31 проц., горш абстаіць справа з добраахвотнікамі—з 94 чалавек, што ёсьць на вучоце пры Б.С., прынялі ўдзел толькі 22 чал.—23,3 проц.

Бязумоўна, гэта зьяўляецца вусім нездавальняючым, што тлумачыцца слабой арганізацыйнай працай па згуртаваньні актыву з рабочых і служачых, слабасьцю інструктаваньня і ўцягненьня ў працу, адсутнасьцю справаздач бюро скаргаў па працягу году на прадпрыемствах і наогул азнаямленьня з характарам і мэтадам працы, слабое асьвятленьне ў друку больш характэрных спраў, якія вырашаліся ў бюро скаргаў.

КУДЗЕЛЬКА.

— У сучасны момант распачата кампанія справаздач бюро скаргаў на прадпрыемствах, а таксама пераабраньня рабочых засядацеляў; першая нарада, якая адбылася 3-га чэрвеня з **фабрычна-зав. актыву, дэлегатам, рабочых засядацеляў, добраахвотнікаў, кіраўнікоў груп і атрадаў лёгкай кавалерыі** паказала вялікую зацікаўленасьць да работы бюро скаргаў і жаданьне дапамагчы гэтай важнай і складанай працы. Унесена цэлы рад прапаноў і паказаньняў у работу бюро скаргаў. Патрэбна кампанію пераабраньня скарыстаць для шырокага азнаямленьня рабочых з работай бюро скаргаў і побач з пераабраньнем засядацеляў паставіць пытаньне вярбоўкі добраахвотнікаў з рабочых прадпрыемстваў для ўдзелу ў працы.

Толькі шляхам уцягненьня шырокіх рабочых мас да працы магчыма весьці барацьбу з бюракратызмам і цеганінай. Кожны рабочы павінен памятаць пастанову 16 партканфэрэнцыі, што:

«Всякая иная борьба с бюрократизмом, не опирающаяся на активность и самодеятельность рабочего класса, пытающаяся подменить контроль самих рабочих и крестьян деятельностью того или иного аппарата, хотя бы самого добросовестного, не может дать никаких серьезных результатов в деле действительного улучшения и коренной перестройки государственного аппарата».



НА ДАПАМОГУ РСІ

СЛОВА ЗАСЯДАЦЕЛЯМІ

(Гутаркі з засядацелямі бюро скаргаў)

Рабочы 1-й друкарні Сьвірыдаў выбраны рабочым засядацелем яшчэ ў мінулым годзе. Ён прысутнічаў прыблізна на 11-12 пасяджэньнях бюро скаргаў.

Вось што ён расказвае аб сабе:

— Ведаеце, адчуваецца, што маеш сталы голас, што з думкаю маёю і іншых засядацеляў лічацца. Напрыклад, па справе амбуляторыі МБВ чыг. наша думка была рашаючай.

— У апошні час я неяк адарваўся ад бюро скаргаў,—гаворыць т. Сьвірыдаў,—там паседжаньні адбываюцца вечарамі, а мая зьмена таксама перайшла працаваць уначы.

— Адносна пратэкцыянізму, цяганіны, бюро скаргаў як сьлед сьцёбае... Прысутнічаў я толькі на адным інструктарскім пасяджэньні. Даручэньні я могбы выконваць у вольны час, але чамусьці даручэньняў бюро скаргаў мне не давала. Праца гэта цікавая, на пасяджэньні я іду з вялікай ахвотай.

— Пра іншых засядацеляў я мала ведаю. Але прыходзіцца наглядаць, што хлопцы ня прыходзяць. Выклікаюць там чалавек сем, а прыходзіць два-тры і то з спазьненьнем. Але тыя, хто ўжо зацікавіўся, ад работы бюро не адыходзяць.

***

Перашлётчыца 1-й друкарні **Лібо** хваліцца і гаворыць, што яна вельмі дрэнна адчувае сябе таму, што не навучылася выказвацца:

— Я малапісьменная, парасійску мала разумею. Вучылася я мала. Мяне гэта справа вельмі цікавіць, але няпрысмна сядзець так, нічога не гаворачы.

Другія засядацелі гавораць, што на пасяджэньнях ім удзяляюць увагу, а наогул з імі мала вядуць працу. Даручэньні яны маглі выконваць, але ім рэдка іх даюць. Яны расказваюць свае ўражаньні аб бюро скаргаў:

Адчуваеш сябе, як на вытворчасьці. Грубасьці з наведвальнікамі мы не наглядалі. Часта пытаюць у нас, як наша думка.

Рабочы фабрыкі абутку т. **Шыманскі** гаворыць прыблізна тое самае, даручэньні ён мог-бы выконваць, але ён выканаў толькі адно па сваёй фабрыцы...

А. К.

Мае 53 справы

Працаваць добраахвотна я прышоў у бюро скаргаў у сярэдзіне лістапада 1928 г. За ўвесь пэрыяд часу, г. зн. з лістапада па май 1929 г., мною расьсьледвана па заданьні 53 справы. Справы розныя: пратэкцыянізм, кумаўство, наём працаўнікоў бяз біржы працы, грубыя адносіны да пайшчыкаў, няправільная пасылка на работу біржай працы і шмат іншых фактаў, што скажаюць савецкія законы. Прымаў блізкі ўдзел у расьсьледваньні справы брандмаёра пажарнай аховы гр-на Гіндзіна, працаваў па заданьні інспэктуры кантрольнай групы па справе 3-й амбуляторыі (загадчык т. Пісарэўскі).

Я зладзіў у пакраўні пшанічнай мукі загадчыка гаспадаркай 2-й савецкай больніцы, які зьняты з работы, выключаны з партыі і сядзіць у папраўчым доме.

Працаваць у большасьці выпадкаў прыходзіцца пасьля сваёй асноўнай работы (працую на шпалернай фабрыцы імя Вароўскага), вольны час аддаю рабоце на лініі бюро скаргаў.

Работай у бюро скаргаў вельмі здаволены. Адносіны да мяне з боку асоб, да якіх мне прыходзіцца зьвяртацца па справе,—уважлівыя; але бываюць выпадкі, праўда, вельмі рэдка, калі кіраўнік установы, да якога прыходзілася зьвяртацца па справе, даведаўшыся, што я беспартыйны, не даваў патрэбных вестак, або неахвотна адказваў на мае пытаньні.

Вось коратка аб тым, як працякае мая добраахвотная работа ў бюро скаргаў. Я гатоў у далейшым не паслабляць тэмпу работы па гэтай лініі.

Б. МУЛЯРЖЭВІЧ.

На дапамогу РСІ ідзе сьвежая армія рабочага актыву

ПЕРАДАВЫЯ РАБОЧЫЯ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ТОЛЬКІ ПРЫ АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ МАС МОЖНА ПАСЬПЯХОВА ЗМАГАЦЦА З БЮРАКРАТЫЗМАМ

Усю вялізарную работу па расьсьледваньні і разглядзе шматлікіх заяў, скаргаў і спраў, якія паступаюць у бюро скаргаў, цяжка, проста немагчыма сабе ўявіць бяз масавай дапамогі саміх працоўных. Гэтым тлумачыцца тая асаблівая цікавасьць, якую выклікае работа актывістых, нашых масавых дапаможнікаў, пры непасрэдным удзеле якіх бюро скаргаў і праводзіла ўсю сваю штодзенную работу.

Рабочыя засядацелі

Гэта адзін з найбольш галоўных інстытутаў. Рабочых засядацеляў, абраных на рабочых сходах, пры аб'яднаньні бюро скаргаў усяго 54. У пераважнай большасьці гэта ўсё рабочыя з вялікім вытворчым стажам, якія карыстаюцца аўтарытэтам у рабочых масах. Цяперашні склад засядацеляў падзяляецца такім чынам: ад Меншвею—8 чал., друкарні БДВ—7, гуты—5, «Энэргія»—5, «Камунар»—4, «Беларусь»—2, гарбарні «Бальшавік»—4, шчаціннай фабрыкі—2, фабрыкі абутку—2, МБВ чыгункі—7 і інш.

Рабочыя засядацелі займаюцца расьсьледваньнем асобных спраў, потым зьяўляюцца дакладчыкамі на гэтых справах і прымаюць актыўны ўдзел ва ўхваленьні пастаноў па іх. За апошні 6-цімесячны пэрыяд у 22 пасяджэньнях бюро скаргаў удзельнічала 58 рабочых засядацеляў. Асобныя засядацелі за гэты пэрыяд удзельнічалі па некалькі раз у пасяджэньнях бюро скаргаў. Гэта работа многіх з іх вельмі цікавіць. Асобныя засядацелі прыходзяць на пасяджэньні без чаргі, добраахвотна.

Удзел рабочых у пасяджэньнях бюро скаргаў мае вялікае значэньне пры ўхваленьні тых або іншых пастаноў па справах аб бюракратызьме, цяганіне і г. д. Рабочыя засядацелі досыць часта настойліва патрабуюць і супольна з імі бюро скаргаў прымае суровыя меры па караньня ў адносінах да «канкрэтных насіцеляў зла». Мы бачым, што дзякуючы ўдзелу рабочых у працы бюро скаргаў яго «карная» дзейнасьць у адносінах да бюракратаў, асабліва па пратэкцыянісцкіх справах, за апошні час значна ўзмацнілася. На прадпрыемствах яны зьяўляюцца жывым зьвязваючым вывяном паміж рабочымі і РСІ.

Добраахвотнікі, дэлегаткі і члены сэкцыі РСІ гарсавету

Добраахвотнікаў пры АБС зараз мічыцца да 100 чалавек. Гэта рабочыя і служачыя, якія па закліку РСІ добраахвотна займаліся ў якасьці дапаможнікаў РСІ. Яны займаюцца расьсьледваньнем розных спраў і потым дакладваюць аб іх на пасяджэньнях бюро скаргаў.

Дэлегаткі, члены сэкцыі РСІ пры гарсавеце, як і добраахвотнікі, шырока прыцягваліся пры правядзеньні масавых абсьледваньняў, «налётаў» РСІ на савецкія ўстановы, пры абсьледваньні цэн па каапэрацыйных крамах, пры «налёце» на мэдычныя ўстановы і г. д.

«Лёгкія кавалерыстыя»

Асабліва ўзорны ўдзел у рабоце АБС прымаюць лёгкія кавалерыстыя. З агульнай колькасьці кавалерыстых па Менску на 36 атрадах у складзе 332 чал. да АБС прымацаваны 136 кавалерыстых, па ўсёй-жа Беларусі іх ёсьць да **1.000 чалавек.** Аб ступені актыўнасьці іх удзелу ў рабоце бюро скаргаў досыць яскрава гаворыць наступныя лічбовыя паказальнікі: з агульнай колькасьці спраў, якія граходзілі праз АБС—40% распрацаваны лёгкімі кавалерыстымі, прычым 59 кавалерыстых выканалі па 1 заданьні, 23—па 2, 17—па 3, 20—па 5 і 17 кавалерыстых выканалі на 10 і больш заданьняў.

«Лёгкая кавалерыя» бясспрэчна даказала сваю жыцьцёвасьць у барацьбе з бюракратамі, безгаспадарнікамі і рознымі недахватамі нашага апарату. Але кіраўніцтва работай «Л. К.» пастаўлена яшчэ нездавальняюча. Яго трэба ў далейшым яшчэ значна палепшыць і ўдасканаліць.

Нашы хібы

Зразумела, што пакуль што мы вырабілі толькі першыя крокі па шляху актыўнага прыцягненьня масавых дапаможнікаў у работу АБС. Мы маем яшчэ нмат недахватаў у гэтым напрамку.

Галоўны недахват—**гэта абсалютная невыстарчальнасьць арганізатарскай работы з боку РСІ з сваім актывам.** Вельмі мала было інструкцыйных нарад для абгаварэньня мэтадаў работы, для абмену практыкай паміж сабою. Такім чынам, досыць часта здаралася, што асобным актывістым прыходзілася дзейнічаць «на сваю рызыку», многія добра ня ведалі сваіх абавязкаў.

Пры даволі значным наогул актыве РСІ (314 чал.) АБС не ўдалося многіх з іх уцягнуць у актыўную работу. Асабліва гэта трэба сказаць аб добраахвотніках, з якіх большая колькасьць аказалася нескарыстанай (з 94 добраахвотнікаў прыцягваліся толькі 22).

***

Зараз адбываюцца перавыбары рабочых засядацеляў. Колькасьць іх павялічваецца да 150 рабочых з 30-ці прадпрыемстваў г. Менску.

Ужо праведзена 15 перавыбарчых сходаў на прадпрыемствах. Сходы праходзяць з вялікай актыўнасьцю. У склад рабочых засядацеляў выбіраюцца актыўныя і аўтарытэтныя рабочыя з вялікім вытворчым стажам.

Задача АБС, па падставе мінулае практыкі і тых прапаноў, якія былі ўнесены рабочымі на сходах, разгарнуць работу з гэтай ідучай насустрач РСІ сьвежай арміяй рабочага актыву

М. ЗЯРНІЦКІ.

АКТЫВІСТЫЯ РСІ

Мупяржэвіч Шнэйдэр Сапожнікаў Барташэвіч Патрыковіч Шыманскі

Ці даволі мы караем бюракратаў?

Адносна карнай дзейнасьці бюро скаргаў і РСІ

У ліку ўмоў, якія спрыяюць пасьпяховай барацьбе з бюракратызмам, цяганінай, пратэкцыянізмам і йш. недахопамі нашага апарату—даволі значнае месца займае рашучая барацьба і пакараньне «канкрэтных насіцеляў зла». Усім вядома, як рашуча падкрэсьліваецца ва ўсіх артыкулах Ільліча неабходнасьць паказальнага «ўсенароднага» пакараньня бюракратаў, бязьлітаснай з імі барацьбы, «ня гледзячы на асобы».

Ці праводзім мы, як належыць, гэтыя наказы Ільліча? У прыватнасьці, як пастаўлена гэта справа ў бюро скаргаў РСІ, якое займае перадавыя пазыцыі на гэтым фронце нашай барацьбы з недахопамі дзярж. апарату?

Пры больш падрабязным азнаямленьні з лічбамі спагнаньняў за пратэкцыянізм, аказваецца, што ў бюро скаргаў устанавілася гэткая практыка: прыняты па пратэкцыі зьнімаюцца з працы (гэта добра, але толькі палова справы), а прыняўшыя, тыя, якія «устроили» роднага чаланвечка, іншымі словамі—найбольш вінаватыя ў парушэньні пастановы ЦКК—тым... выносіцца вымова або «на від».

Вось лічбы. З агульнага ліку 33 спраў па пратэкцыянізьме 13 радавых працаўнікоў, прынятыя па пратэкцыі (бяз біржы працы), былі рашэньнем бюро скаргаў зьняты з працы; дапусьціўшым-жа гэтыя факты пратэкцыянізму адказныя працаўніком ці установам вынесены вымовы (17) і толькі два адказныя працаўнікі (заг. працыкалектывам, член праўленьня каапэрацыйнага органу) за такія праявы зьняты з працы.

Падамо некаторыя прыклады:

У арцелі «Гарапашнік» бухгальтар прыняты бяз біржы працы. Ён звальняецца. Добра. А загадчыку арцелі—прыняўшаму... вымова. І толькі! У 2-й сав. больніцы такі-жа выпадак. Працаўнікі зьнімаюцца, а адказным за прыём—галоўнаму доктару і заг. гаспадаркай—вымова. Тут, у больніцы, гэткія факты праз некалькі месяцаў паўтарыліся, а рашэньні бюро скаргаў і ў другі раз былі аднолькавыя. Гэткія-ж справы мелі месца ў МЦРК, Белторфе, на заводзе «Бальшавік», у «ГЭТ», у клюбе друкароў і ў іншых мясцох. Рашэньні бюро скаргаў выносіліся—за невялікімі выключэньнямі—адноль каныя, «стэрэатыпныя»: прынятых—зьняць, прыняўшым—вымова.

Нам здаецца, што самая практыка працы бюро скаргаў гаворыць за тое, што **вымовы, што выносяцца, належных вынікаў** у справе барацьбы з пратэкцыянізмам **не даюць.** Мы бачылі на прыкладах, што кіруючыя працаўнікі, ня гледзячы на атрыманыя суровыя вымовы, досыць часта парушаюць і надалей існуючыя правілы прыёму на працу. «Тетенькин хвост» усё яшчэ дзейнічае пры прыёме.

За ўсякія праявы бюракратызму, цяганіны выносіліся таксама ў лепшым выпадку толькі вымовы. У нас няма выпадкаў зьняцця з працы ці перададзены ў суд для паказальнага працэсу вінаватых за найбольш злосныя праявы бюракратызму, цяганіны і пратэкцыянізму, як раіў Уладзімер Ільіч. А між тым гэткія справы праходзілі і ў бюро скаргаў (пратэкцыяніцкія справы) і асабліва ў калегіі НК РСІ (напрыклад за факты бюракратызму і цяганіны з боку працаўнікоў розных цэнтральных устаноў пры правядзеньні падрыхтоўчай працы да пасеўнай кампаніі, злосныя факты парушэньня дырэктыў аб 20 проц. зьніжэньні адм.-гасп. выдаткаў і г. д.).

Па нашай думцы, бюро скаргаў ад гэтай практыкі вынясеньня вымоў трэба перайсьці да больш моцна ўплываючых сродкаў барацьбы з бюракратамі. Пасяджэньні бюро скаргаў на найбольш характэрных справах трэба перанесьці на прадпрыемства, у рабочыя клюбы, у масы, на адкрыты разгляд—ужо адно гэта зьяўляецца моцным ударам для бюракратаў.

Далей рабочыя засядацелі, рабочая маса, мы ўпэўнены, дапамогуць бюро скаргаў знайсьці гэткія моцныя сродкі ўзьдзейнічаньня на бюракратаў, якія адаб'юць усякую ахвоту ў іншых нашых працаўнікоў «подражать» ім парушаць дырэктывы нашай партыі і ўраду і тым самым перашкаджаць рабочай клясе ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Актывісты РСІ.

Выкананьне пастаноў РСІ—пад кантроль мас

За апошнія два-тры гады работа КК-РСІ праводзіцца пры ўсё больш шырокім удзеле рабочай грамадзкасьці, нізавых прафарганізацый, вытворчых і эканомкамісій і нарад. Усё ў большай меры органы КК-РСІ арганізуюць свае абсьледваньні з прыцягненьнем прафсыянальных і іншых арганізацый і супольна з апошнімі распрацоўваюць мерапрыемствы, накіраваныя да паляпшэньня работы прадпрыемстваў і ўстаноў.

Аднак, праверка выкананьня ўстановамі і прадпрыемствамі пастаноў органаў КК-РСІ пацьвярджае наяўнасьць вялікай цяганіны і супраціўленьне апарату пры правядзеньні ў жыцьцё прапанаваных органамі КК РСІ мерапрыемстваў, дзякуючы чаму вельмі часта дырэктывы ўраду і РСІ застаюцца нявыкананымі. У значнай меры гэта можа тлумачыцца тым, што рабочыя масы ня прымаюць удзелу ў кантролі над выкананьнем прынятых пастаноў КК-РСІ. Не гаворачы аб пастановах па пытаньнях складаных (капітальнае будаўніцтва, зьніжэньне сабекошту і інш.) ёсьць выпадкі, калі нават пастановы бюро скаргаў аб пэрсанальных спагнаньнях (зьняцьце з работы, адміністрацыйнае спагнаньне) таксама ня выконваюцца, а такія факты з боку нізавых прафарганізацый без асаблівай страты часу могуць быць праверены.

Да гэтага часу ў практыцы работы ЦКК-РСІ для праверкі выкананьня пастаноў апошніх нізавыя грамадзкія арганізацыі прыцягваліся слаба (прыблізна 10-15 проц. усяго аб'ёму работы).

Але і гэтая невялікая практыка паказвае, якую значную дапамогу і карысьць можа даць грамадзкасьць органам КК-РСІ. Досыць успомніць праверку пастаноў НК РСІ БССР, арганізаваную праз друк па пытаньні народнага харчаваньня. У 1928 г. «Зьвязда» сыгналізавала пагрозу спыненьня заводу імя Домбаля з-за адсутнасьці сыроцу. Адміністрацыя трэсту ў сваім адказе супакойвала грамадзкасьць, і лічыла, што паніку ня варта было падымаць. Гэты адказ абгаворваўся на сходзе рабкораў заводу, яны асудзілі адказ адміністрацыі і ЦКК з імі згадзілася. Вытворчая камісія 1-й дзяржаўнай друкарні па сваёй ініцыятыве зьвярнулася ў ЦКК-РСІ з тым, што адміністрацыя ня выконвае пастаноў прафсаюзаў і КК-РСІ аб рэагаваньні на прапановы рабочых і г. д.

Але досыць часта нізавыя арганізацыі, правяраючы той ці іншы матар'ял, ня цікавяцца дасканала справай, надта давяраюць розным афіцыйным спраўкам, якія прадстаўляе адміністрацыя. ЦКК КП(б)В паслала матар'ял аб цеганіне ў Лесбеле ў парт'ячэйку ВСНГВ. Апошняя атрымала ад «зацікаўленай» асобы даведку і пры сваёй адносіне накіравала ў ЦКК. Прышлося вярнуць перапіску назад з паказаньнем, што парт'ячэйка павінна была падыйсьці не фармальна, а праверыць справу па сутнасьці.

Пасьля гэтага парт'ячэйка прыслала вельмі добры, усебакова высьветлены матар'ял.

Нізавым прафэсыянальным і партыйным арганізацыям, якія ўзяліся за праверку пастаноў КК-РСІ, **прыдзецца стаць вышэй мясцовых інтарэсаў і «апаратнай сямейнасьці», лічачы, што правяраюцца не якіясь пабочныя дырэктывы, а пастановы, што дапамагаюць усяму нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, усёй рабочай клясе.**

Выходзячы з усяго гэтага ЦКК УсеКП(б) супольна з УсеЦСПС разаслала ўсім прафэсыянальным арганізацыям і органам РСІ інструкцыю аб удзеле рабочых мас у праверцы выкананьня пастаноў КК-РСІ. Гэтай інструкцыяй органы КК-РСІ абавязваюцца пасылаць свае пастановы і матар'ялы ня толькі адміністрацыі, **а і грамадзкім арганізацыям,** на якіх укладаецца праверка. Апошнія павінны будуць кожны дзень назіраць, як ажыцьцяўляюцца пастановы РСІ. Па найбольш складаных і буйных пытаньнях на прадпрыемствах будуць арганізоўвацца **часова-кантрольныя камісіі** і г. д.

П. ПАСЮКЕВІЧ.

Зрабіўшы першы крок, шагаць далей

ЗАВЯЛІЧЫЦЬ КАДРЫ ДАПАМОЖНІКАЎ РСІ

(РЭЗАЛЮЦЫЯ РАБОЧАГА АКТЫВУ ПРЫ РСІ)

Заслухаўшы даклад тав. **Лазоўскага** аб рабоце Аб'яднанага бюро скаргаў НК РСІ Бел. і задачах барацьбы з бюракратызмам, агульны сход рабочага актыву пры РСІ адзначае, што работа бюро скаргаў за справаздачны пэрыяд была накіравана на рашучую барацьбу са зьявішчамі бюракратызму, цяганіны, пратэкцыянізму, безгаспадарчасьці і інш. недахопамі савецкага і гаспадарчага апарату.

Агульны сход, адзначаючы некаторыя посьпехі па прыцягненьню рабочага актыву шырокіх працоўных мас у работу ЦКК-РСІ праз рабочых засядацеляў, добраахвотнікаў, дэлегатак, лёгкую кавалерыю, разам з тым лічыць, што гэтыя посьпехі зьяўляюцца **першымі крокамі** на вырашэньні задачы прыцягненьня рабочых мас. Таму завастрае ўвагу ўсіх рабочых на неабходнасьць шырокага актыўнага ўдзелу ў рабоце ЦКК-РСІ, асабліва па лініі бюро скаргаў.

ЦКК-РСІ неабходна яшчэ больш праяўляць арганізуючую ролю на скарыстаньні ініцыятывы рабочых (лёгкая кавалерыя, рабочыя засядацелі, добраахвотнікі, дэлегаткі і інш.), на барацьбу з бюракратызмам і цеганінай і інш. хваравітымі зьявішчамі ў савецкім апараце.

У якасьці канкрэтных мерапрыемстваў у далейшай рабоце Аб'яднанага бюро скаргаў сход высоўвае:

— Неабходнасьць павялічэньня практыкі перанясеньня разбору больш характэрных спраў непасрэдна на прадпрыемствы (рабочыя сходы, клюбы);

— пэрыядычна арганізоўваць справаздачы аб рабоце Аб'яднанага бюро скаргаў на шырокіх рабоч. сходах, завастраюць увагу рабочых на больш характэрных групах скаргаў (бюракратызм, цеганіна, безгаспадарчасьць, пратэкцыянізм) з тым каб арганізаваць масу для рашучай барацьбы з гэтымі агіднымі зьявішчамі;

— Аб'яднан. бюро скаргаў праверыць выкананьне дырэктывы ЦКК-НК РСІ аб устаноўцы скрынак скаргаў на прадпрыемствах, клюбах і арганізаваць больш сталы кантроль за рэагаваньнем па скаргах рабочых і наогул працоўных. Для рэагаваньня на скаргі—максімальна скарыстаць друк, асабліва пасьценгазэты.

Агульны сход лічыць, што Аб'яд. бюро скаргаў патрэбна больш уцягнуць сэкцыю РСІ гарсавету і інш. сэкцыі для дапамогі ў сваёй рабоце, ставячы перад імі пытаньні аб вывучэньні вынікаў па скаргах, аб становішчы хваравітых зьявішч тэй ці інш. установы, часткі ці цэлай галіны апарату.

Надаючы вялікае значэньне ініцыятыўнаму руху рабочай моладзі, камсамолу ў выглядзе «лёгкай кавалерыі», адзначаючы наліччa шматлікавых фактаў уворнага ўдзелу «лёгкіх кавалерыстых» у барацьбе з бюракратызмам, агульны сход лічыць, што з боку ЦКК-РСІ патрэбна лепш арганізаваць кіраўніцтва і сувязь з камсамолам, выхоўваючы, такім чынам, з рабочай моладзі будучыя кадры ў дзяржаўны і гаспадарчы апарат.

Агульны сход заклікае ўсіх рабочых прыняць самы актыўны ўдзел у перавыбарчай кампаніі рабочых засядацеляў і абгаварэньні работы бюро скаргаў, мабілізуючы ў сувязі з гэтым увагу ўсяе рабочае клясы навакол важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

З партфэлю бюро скаргаў

Факты, якія кажуць аб неабходнасьці чысткі апарату

2 капейкі... што 20 рублёў

Дзень, калі думка гэта запала ў галаву лясьнічага Савінеўскага, застаўся невядомы. На паперы зафіксавана толькі падзея, якая ўжо адбылася, на паперы быў толькі нумар з канцылярыі Ціхініцкага лясьніцтва з неадменным пунктам абежніку, на падставе чаго гэта усё было зроблена.

Паперка гэта ў звычайным канвэрце, звычайнай поштай прышла ў Бабруйскае аддзяленьне Дзяржбанку. Адрасат узяў у рукі канвэрт, паглядзеў на сьвятло і выняў кароткае сухое паведамленьне т. Савінеўскага.

Невядомы нам па прозьвішчы старанны і акуратны супрацоўнік запісаў гэтую паперку ў бухгальтарскія кнігі Дзяржбанку, правёў таксама па гэтых кнігах і грашовую суму, надасланую т. Савінеўскім.

Цень недавер'я, ці зьдзіўленьня не прабег пры гэтым па твары супрацоўніка банку. Пад ціхі гоман у аддзяленьні зрабіў ён у кнізе гэтую, здавалася, звычайную і будзённую апэрацыю, якіх тысячы прарабіў на сваім слаўным жыцьцёвым шляху невядомы нам па прозьвішчы супрацоўнік.

Што-ж агіднае зроблена лясьнічым і яго новым калегай па банку? Абодва яны старанна запісвалі і заносілі ў кнігі апэрацыі на... **дзьве капейкі.** Так тав. Савінеўскі і думаў, робячы гэта, пасылаючы з Ціхініч у Бабруйскае аддзяленьне Дзяржбанку **«дзьве капейкі на адмаўленьне крэдыту».** Так і зрабіў сьціплы невядомы супрацоўнік, правёўшы па ўсіх банкаўскіх кнігах гэтую, як яму здавалася, звычайную апэрацыю.

У гэтай справе нас зьдзіўляе простая звычайная рэч: як маглі дайсьці да такой грані тупасьці і дзіўнага закасьцянелага бюракратызму людзі, якія жывуць у краіне, дзе так жорстка і асабліва зараз змагаюцца з бюракратызмам? І напэўна лясьнічы і служачыя банку чытаюць газэты, напэўна яны ня раз падымалі рукі на сходах, калі прымаліся бязьлітасныя рэзалюцыі, заклікаўшыя з «коранем вырваць злосную балячку бюракратызму».

Але нас зьдзіўляе яшчэ і тое, што акруговае бюро скаргаў абмежавалася тым, што пастанавіла **«паставіць на від лясьнічаму Савінеўскаму»** і **«прыняло да ведама»,** што супрацоўніку банку дана ўжо вымова.

Ці так трэба караць гэтыя нячуваныя выпадкі? Ці ўтворым мы пры такіх мерах рэагаваньня з боку РСІ вакол гэтых бясчынстваў грамадзкую думку, якая пры кожным іх праяўленьні ўздымала-б абурэньне мас? Лічбы гавораць аб тым, што балячка бюракратызму яшчэ ня зжыта, што яна навялічваецца. А гэта на сутнасьці фармальная пастанова акруговага бюро скаргаў вусім ня ўздымае абурэньне супроць вось такіх нячуваных выпадкаў бюракратызму. Было-б ня дрэнна, каб такія справы праходзілі праз пракуратуру, было-б вусім ня лішнім, каб саўгандальслужачыя Бабруйску наладзілі шырокі паказальны суд над супрацоўнікам банку, каб аб справе лясьнічага даведаліся ва ўсіх службовых установах, каб зразумелі дзікасьць гэтага, каб убачылі гэтую грань атупеньня і фармалістыкі, да якое дайшоў лясьнічы Ціхініцкага лясьніцтва Бабруйскай акругі...

11 установ і 41 загад

Адны і тыя піткі цягнуцца ад справы з дзьвюма капейкамі да справы Барысенка. Яго справа пабачыла адзінаццаць устаноў, па якой за 4 гады быў аданы 41 загад і ўсё такі справа яго заставалася нявырашанай.

Мы ў двух словах намомнім яе сумную, прыкрую сутнасьць.

... У 1924 годзе Барысенка высек два дрэвы на сваёй палосцы зямлі, заплаціўшы за іх КСУ 5 рублёў. У гэтым-жа годзе міліцыянэр Гарбуноў, праходзячы па вёсцы, убачыў сьсечаныя дрэвы пад паветкай Барысенкі і склаў пратакол, а потым нарсуд налажыў штраф у 47 рублёў. Хадзіў тады Барысенка па прапойскіх установах, пісаў ён, што міліцыянэра гэтага яго, Барысенкава, жонка ня пусьціла аднойчы да сябе начаваць. Але хто зьвярнуў увагу на скаргі старога Барысенкі,—хутка ўзялі ў яго а хлява каня і прадалі за 16 рублёў.

Так хадзіла гэтая справа 4 гады, так і пісалася па ёй 40 бясьсільных загадаў.

Справа Барысенкі нячуваная справа, але ня менш хвалюючы і іншыя справы.

ПЛЕНУМ ЦСПСБ

КУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ РАБОТА ПРАФСАЮЗАЎ

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ—НА ПЕРШЫ ПЛЯН КЛЮБНАЙ РАБОТЫ!

Даклад т. Аверына

Сацыялістычнае наступленьне пралетарыяту на капіталістычныя элементы гораду і вёскі сустракае ўпартае супраціўленьне клясавага ворага. Гэта ставіць перад прафсаюзамі адказнейшую задачу мабілізацыі шырокіх рабочых мас вакол пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва.

Ва ўмовах БССР—краіны сялянскай, шматнацыянальнай, з вельмі слабым пралетарскім ядром,—гэтыя задачы набываюць асабліва вялікае значэньне.

У штодзённай рабоце па культурным выхаваньні рабочых мас прафсаюзы накіроўваюць асноўную ўвагу **на шырокае растлумачэньне сярод членаў профсаюзаў генэральнай лініі камуністычнай партыі і савецкай улады.** Усе мэтады і формы масавай культурна-выхаваўчай работы ўвязваюцца з папулярызацыяй пастаноў камуністычнай партыі.

Ня гледзячы на цяжкія ўмовы, у якіх прафсаюзы праводзяць сваю культмасавую работу (цесната памяшканьняў, недахват сродкаў і г. д.), усё-ж на гэтым фронце ўдалося дабіцца значных посьпехаў.

За апошні час культкамісіі на прадпрыемствах разгарнулі работу па палітычным і культурным выхаваньні рабочых мас. Клюбы ўзмацнілі сваю дзейнасьць, увязалі сваю працу з чарговымі задачамі нашага будаўніцтва, прыцягнулі рабочых да актыўнага ўдзелу ў кампаніях, што праводзяцца партыяй і савецкай уладай. Клюбныя гурткі здолелі досыць добра абслужыць рабочыя сходы пры перавыбарах саветаў, наладжвалі антырэлігійныя карнавалы і г. д.

Аднак, у культмасавай рабоце прафсаюзаў ёсьць шмат недахватаў. Дагэтуль яшчэ **рад важнейшых палітычных кампаній не знайшоў свайго адлюстраваньня ў штодзённай рабоце клюбаў і чырзоных кутко ў на прадпрыемствах.**

Узяць хаця-б сацыялістычнае спаборніцтва. Клюбы яшчэ дагэтуль удзяляюць мала ўвагі гэтаму вялікаму мерапрыемству рабочай клясы. **Слаба адбіваецца ў рабоце клюбаў барацьба з рвацтвам, прагуламі, антысэмітызмам, п'янствам і хуліганствам.**

Дагэтуль яшчэ ўся работа многіх клюбаў зводзіцца да настановак, кіно спэктакляў. Іншыя-ж формы масавай работы (вечары пытаньняў і адказаў, лекцыі, даклады, гучныя чыткі, гутаркі) мала скарыстоўваюцца ў рабоце клюбаў.

Слаба абслугоўваюцца клюбамі сэзонныя. У інтэрнатах і казармах сэзоннікаў рэдка праводзяцца лекцыі, даклады, яшчэ больш рэдка—вечары.

— Нам трэба дабіцца,—кажа Аверын,—**каб сярод найбольш адсталых груп рабочых, якімі зьяўляюцца сэзоннікі, зьвязаныя ў большасьці сваёй з вёскай, вялася сыстэматычная, штодзённая культурна-выхаваўчая работа.** Трэба мабілізаваць увагу будаўнікоў-сэзоннікаў вакол пытаньня патаненьня будаўніцтва.

Антырэлігійная работа яшчэ не займае належнага месца ў рабоце прафсаюзаў. Ажыўленьне дзейнасьці сэктантаў і царкоўнікаў патрабуе ад прафсаюзаў больш пільнай увагі да работы па антырэлігійным выхаваньні мас. Трэба як мага пашырыць сетку ячэек саюзу «Бязбожнік» на прадпрыемствах, усярмерна дапамагаць ім у рабоце.

Ня меншую ўвагу трэба ўдзяліць **інтэрнацыянальнаму выхаваньню рабочых.** Выпадкі антысэмітызму і шавінізму, якія мелі месца ча радзе прадпрыемстваў (гута «Кастрычнік», гарбарня «Бальшавік», Добруская фабрыка, цагельня ў Бабруйску і інш.), сьведчаць аб тым, **што прафсаюзы мала што робяць у справе інтэрнацыянальнага выхаваньня членаў прафсаюзаў.**

Недапушчальна нядбайна адносяцца прафсаюзы да дырэктыў партыі аб беларусізацыі. Большасьць клюбаў праводзіць сваю работу на расійскай мове, тое самае і на прадпрыемствах, дзе даклады, лекцыі, гутаркі праводзяцца ў большасьці на расійскай мове.

Між тым, яшчэ 3-ці пленум ЦСПСБ у красавіку мінулага году даў пэўны тэрмін для беларусізацыі работы прафсаюзаў і клюбаў. Тэрмін даўно ўжо мінуў, а мы вельмі мала зрабілі ў гэтым напрамку.

Наша задача **дабіцца, каб да канца бягучага году ўсе прафсаюзныя клюбы, чырвоныя куткі і г. д. канчаткова перавялі сваю работу на беларускую мову.**

Нарэшце, т. Аверын спыняецца на рабоце бібліятэк, чытальнь на пытаньнях укараненьня ў прафсаюзныя масы вайсковых ведаў.

Г. С.

Перад прызывам

Добраахвотныя таварыствы і прызыў

Пры чарговым прызыве ўвосень гэтага году армію будзе патрэбна вялікая колькасьць спэцыялістых для спэцыяльных часьцей чыгуначных, сапёрных, радыё-часьцей, часьцей сувязі і г. д.

Навучаць аднэй з спэцыяльнасьцяй прызыўніка, які да таго ня меў ніякае справы з гэтай спэцыяльнасьцю, патрэбен доўгі час. Гэта адбірае з службы байца ў Чырвонай армії два-тры месяцы на папярэдняе азнаямленьне яго з асновамі спэцыяльнасьці, на якую ён прызначаны. Калі прызыўнік прыдзе ў казарму элемэнтарна падрыхтаваным, калі яму ня прыдзецца вучыцца з пачатку, гэта дасьць магчымасьць у разох армії выпрацаваць з яго больш кваліфікаванага спэцыялістага.

У мінулым годзе ўпярэдняю значную дапамогу ў гэтых адносінах аказалі добраахвотныя таварыствы — Асоавіяхім, таварыства прыхільнікаў радыё, «Тэхніка—масам» і інш.,—якія арганізавалі па Саюзе сетку гурткоў і курсаў па падрыхтоўцы прызыўнікоў да службы ў спэцыяльных часьцях РСЧА.

Зараз яшчэ нічога ня чуваць, каб добраахвотныя таварыствы дзе-небудзь выступілі да работы па падрыхтоўцы прызыўнікоў. А між тым, да пачатку прызыву засталося ўсяго толькі 2 з паловаю месяцы.

Мы напамінаем устаноўку Галоўнага Кіраўніцтва РСЧА: пры падыходзячым прызыве ў радыё-часьці ў першую чаргу накіроўваюцца радыё-аматары, якія скончылі ваенізаваныя курсы ТПР, прафсаюзаў і інш. таварыстваў, якія маюць вучотна-радыё-аматарскія білеты в адзнакаю аб скончэньні гэтых курсаў.

У першую-ж чаргу ў радыё-часьці павінны накіроўвацца арганізаваныя радыё-аматары, якія маюць насьведчаньне аб скончэньні аднаведных гурткоў.

Скончэньні тэлеграфна-тэлефонныя курсы таварыства «Тэхніка—масам» накіроўваюцца ў палкі, батальёны і роты сувязі.

Галубаводы-аматары будуць пры прызыве накіроўвацца ў гадавальнікі-школы вайсковага галубаводзтва.

Аматары-сабакаводы, пераважна аматары службовага сабакаводзтва, накіроўваюцца ў школы гадавальніка вайсковага сабакаводзтва.

Конныя сэкцыі Асоавіяхіму на мясцох павінны прыступіць да арганізацыі кавалерыйскіх гурткоў спэцыяльна для прызыўнікоў.

Тое самае можна сказаць у адносінах стварэньня сапёрных, чыгуначных і інш. гурткоў у арганізацыях Асоавіяхіму.

Сетка падрыхтоўчых гурткоў і курсаў павінна будзе разгарнуцца шырэй і раней, чым летась. Трэба да гэтага прыступіць зараз-жа.

К.

Добрыя віды на ўраджай у Меншчыне

Зьнізіліся цэны на хлеб

Спрыяючае майскае надвор'е дапамагло добраму ўсходу яравых і разьвіцьцю азімых. Пахаладаньне з першых лічбаў чэрвеня ня спрыяюча адбілася на разьвіцьці яравых і асабліва на ячмяні. Наогул-жа, віды на ўраджай гэтага году значна лепшыя, чым у мінулым годзе.

У зьвязку з добрымі відамі на ўраджай, на рынку зьнізіліся цэны на хлеб, які прывозіцца сялянамі. Па некаторых раёнах Менскай акругі цэны на хлеб зьнізіліся амаль на палову.

Пагоршыліся віды на ўраджай садавіны—асабліва мала будзе груш, вішань, чарэшань.

Халоднае паветра дрэнна адбілася на разьвіцьці агуркоў. Па іншых агародных культурах віды на ўраджай добрыя.

МЕНСК

Забесьпяченьне рабочых прадуктамі

Гутарка з старшынёю Белрабсэкцыі т. Кумкесам

Тыя запасы ХЛЕБА, якія ёсьць у Беларусі, даюць магчымасьць, пры правядзеньні жорсткай эканоміі хлеба, забясьпечыць ім працоўнае насельніцтва да новага ўраджаю.

Заборныя кніжкі ўведзены ва ўсіх гарадох Беларусі. Па вестках, якія ёсьць у Белрабсэкцыі, у некаторых мясцох адзначаны выпадкі злоўжываньняў і няправільнага атрыманьня заборных кніжак. Белрабсэкцыя маркуе ў паасобных раёнах правесьці праверку правільнасьці атрыманьня кніжак.

Запасы ЦУКРУ, якія ёсьць у рабочай кааперацыі, даюць таксама магчымасьць забясьпечыць цукрам рабочых да новага ўраджаю. У зьвязку з надыходзячым сэзонам варэньня, пайшчыкам рабочай кааперацыі будзе выдана дадатковая колькасьць цукру ў разьмеры 1 кілё на едака. Выдача гэтага цукру пачнецца ў бліжэйшыя дні.

Рабочая кааперацыя Беларусі пачала атрымліваць зараз большую колькасьць ЧАЮ, як дагэтуль, што дае магчымасьць палепшыць забясьпячэньне. У бягучым квартале завоз чаю для рабочай кааперацыі павялічваецца на некалькі тысяч кілёграм.

На пэрыад да лістапада рабочая кааперацыя атрымае каля 8 тысяч скрынак ЯЕК. Апрача таго, ствараюцца рэзэрвы яек на зімовы сэзон у колькасьці 2-х тысяч скрынак.

У 4-м квартале рабочая кааперацыя павінна атрымаць каля 400 тон масла. Ствараецца рэзэрвовы фонд масла ў 12-15 тысяч пуд. для лепшага забясьпячэньня пайшчыкаў на асеньня-зімовы пэрыяд.

Как забясьпечыць рабочую кааперацыю Беларусі летняй гародзінай, фруктамі і ягадамі, Белрабсэкцыя арганізавала сетку ўпанаважаных у Крыме, на Украіне і іншых раёнах. Праз 1-2 тыдні пачнецца рэгулярнае паступленьне гародніны і фруктаў. Будзе загатоўлена таксама на 1 мільён р. зімовай гародніны. У той час, як у мінулыя гады дагавары на зімовую гародніну заключаліся толькі ўвосень, сёлета рабочая кааперацыя ўжо зараз пачала загатоўку шляхам кантрактацыі. Дагэтуль ЦРК Беларусі заканцрактавала гародніны на 350 тысяч руб.

М. К.

Паездка беларускіх аграномаў па СССР

У бліжэйшы час 40 аграномічных працаўнікоў Беларусі выяжджаюць на Паўночны Каўказ, у Крым і іншыя раёны СССР для азнаямленьня з навейшымі дасягненьнямі па сельскай гаспадарцы. Частка аграномаў едзе ў буйнейшы ў СССР саўгас «Гігант». Аграномічным працаўнікам выдаюцца камандыроўкі тэрмінам на паўтара месяца. Апрача таго, кожны з іх атрымлівае па 200 рублёў. Усе камандыроўкі разьмеркаваны па акругах Беларусі.

Павышэньне кваліфікацыі аграномічных працаўнікоў

З 25-га чэрвеня пры раённых дасьледчых станцыях Беларусі адкрываюцца тыднёвыя курсы для ўзьвышэньня кваліфікацыі аграномаў па пытаньнях павышэньня ўраджайнасьці. Праз курсы будзе прапушчана каля 200 чал.

Новы прыём на курсы мэдычных сёстраў

У новым навучальным годзе на курсы мэдычных сясьцёр ЦК Чырвонага Крыжу будзе прынята 45 чал. Устаноўлены наступны прынцып прыёму: рабочых і дзяцей рабочых 60 проц., батракоў і дзяцей батракоў 20 проц., сялян і дзяцей сялян з бядняцкай і серадняцкай часткі—10 проц., служачых 5 проц., саматужнікаў—5 проц. Перавага будзе аддавацца актыву Чырвонага Крыжу. Узбуджана хадайніцтва аб павялічэньні стыпендыі курсантам да 25 р. у месяц. Заявы будуць прымацца з 15 чэрвеня па 15 жніўня. Заняткі пачнуцца 10-га верасьня.

Цэны на сьвіное сала

Менскаму ЦРК дазволена рэалізаваць у чэрвені з рэзэрвовага фонду 1.000 пудоў сала. Устаноўлены наступныя разьробныя цэны на сьвіное сала: 1 гатунку — 1 р. 40 к. кілёграм, 2-га гатунку 1—р. 15 к. і 3-га гатунку—90 кап.

За дзень

СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БІБЛІЯТЭКАМІ. Агульны сход супрацоў нікаў Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі пастанавіў выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па ўсіх відах бібліятэчнай работы ўсенародную бібліятэку Украіны. Паміж гэтымі бібліятэкамі будзе заключаны палітычны дагавор.

ПАКАЗАЛЬНЫ КАЛГАС. У раёне Камароўкі арганізуецца першы прыгарадны паказальны калгас. Прэзыдыум гарсавету ўхваліў арганізацыю калгасу.

500 ТЫСЯЧ ТАМОЎ. Беларуская дзяржаўная бібліятэка з кожным годам усё больш папаўняецца кнігамі. Зараз яна налічвае поўмільёна тамоў кніг па розных пытаньнях.

СТАЛОЎКІ НА ЦАГЕЛЬНЯХ. Акруговая плянавая камісія ўхваліла праект адкрыцьця пры цагельных Гандальбуду № 1 і 2 спэцыяльных сталовак для абслугоўваньня сэзоннікаў.

ПАД СУД—ЗА НЕПАДАЧУ ПРАЕКТАЎ. Акруговаму пракурору перададены сьпіс раду ўстаноў Менску, якія дагэтуль не падалі праектаў па капітальным будаўніцтве.

2000 РУБЛЁЎ НА РАМОНТ ДАМОЎ АСЬВЕТЫ. ЦК саюзу працасьветы адпусьціў 2 тысячы рублёў на рамонт Гомельскага, Менскага і Полацкага дамоў працаўнікоў асьветы.

Магілеў атрымае ток Асінбуду

Беларускае аддзяленьне дзяржаўнага электратэхнічнага трэсту вядзе перагаворы аб пераработаваньні гарадзкой электрычнай сеткі ў Магілеве ў зьвязку з уключэньнем гораду ў ток Асінбуду першай чаргі. З новых прадпрыемстваў токам Асінбуду будуць карыстацца фабрыка штучнага валакна і завод па выпрацоўцы мастаўя. Электрафікацыяй будзе ахоплены раён гор. Магілева на 10 кілёмэтраў. Усяго Магілеву патрабуецца каля 3-х тысяч клв. энэргіі.

Ці можна разводзіць цукровыя буракі ў Беларусі?

Мэтэарапёгічныя ўмовы Беларусі спрыяюць разьвядзеньню цукровых буракоў.—Паказальныя пасевы далі добрыя ўраджаі буракоў з высокім процантам цукру

Пытаньне аб арганізацыі ў БССР цукровай прамысловасьці і разьвіцьці культуры цукровых буракоў новае. Ва ўсякім выпадку да апошніх часоў яно ня выходзіла за межы чыста тэарэтычных рамак.

Зараз пытаньне аб разьвіцьці культуры цукровых буракоў у Беларусі ставіцца ўжо на практычныя рэйкі. Значны інтарэс выяўляе сабой распрацоўка гэтага пытаньня праф. А. Ключаровым. Тут мы і даем асноўныя палажэньні гэтае працы.

Папершае, трэба адзначыць значэньне разьвядзеньня цукровых буракоў для сельскай гаспадаркі. Культура цукровых буракоў вельмі добра ўплывае на стан гаспадаркі наогул і, ў прыватнасьці, узьнімае ўраджайнасьць усіх с.-г. расьлін.

Для жывёлагадоўлі культура цукровых буракоў каштоўна тым, што дае значную колькасьць пабочных кармавых прадуктаў у выглядзе лістоў, патакі і інш.

Літаратурныя даныя гавораць аб тым, што ў Беларусі існавалі цукровыя заводы, якія ліквідаваліся ў 50-70-х гадох мінулага стагодзьдзя. Цукровыя заводы былі ў гаспадарцы Комара (Калінкавіцкі павет), у гаспадарцы Карказовічы (у былым Слуцкім павеце), а таксама і ў былым Бабруйскім павеце.

Мэтэрэалёгічныя ўмовы Беларусі спрыяюць добраму росту культуры цукровых буракоў. Нават больш паўночныя пункты БССР, як напрыклад, Ворша і Горкі маюць суму тэмпэратур вэгетацыйнага перыяду ў 2.443 град. і 2.411 гр., што гаворыць аб магчымасьці разьвядзеньня цукровых буракоў у БССР.

Сярод пашыраных у Беларусі тыпаў глебы, якія-б зусім падыйшлі для культуры цукровых буракоў, можна лічыць наступныя: сьветлыя і цёмна-шэрыя, падзолістыя глебы не лёсьсе, шэрыя лёсавідныя суглінкі і супесі пры ўмове адпаведнага іх угнаеньня. Вельмі цікава і важна зрабіць досьледы пасадкі цукровых буракоў таксама на тарфяных глебах.

Ёсьць рад момантаў, што спрыяюць аднаўленьню беларускай буракова-цукровай прамысловасьці. Да гэткіх момантаў адносяцца: наяўнасьць зараз высока-цукровых рас буракоў, магчымасьць ужываньня самых апошніх удасканаленьняў у тэхніцы цукраваньня і, урэшце, магчымасьць скарыстаньня новых шляхоў, якія намячаюцца ў гэтай галіне прамысловасьці, як, напрыклад, атрыманьне цукру з сушаных буракоў.

Досьледы пасеву буракоў у Беларусі В. Іваноўскім у 1910 і 1911 г.г. і інжынэрам Гурскім у 1915-16 і 17 г. г. далі вельмі добрыя вынікі. Прыходзіцца сумняваць, каб у былым Бабруйскім павеце цукровыя буракі давалі больш 500 пуд. цукру з дзесяціны буракоў.

Практыка разьвядзеньня культуры цукровых буракоў у Беларусі ў 1928 годзе і лябараторныя досьледы атрыманых буракоў далі наступныя вынікі. Буракі, якія былі пасеяны ў саўгасах Аршанскай акругі, мелі ад 17 да 17,85 проц. цукру; буракі Горацкай дасьледчай станцыі мелі ад 17,24 да 18,73 проц. цукру, буракі, пасеяныя ў Магілеўскай акрузе—ад 15,89 да 18,21 проц.; прыблізна такія-ж вынікі былі дасягнуты па іншых акругах БССР.

Што датычыць ураджаю буракоў і выхаду цукру з іх, дык яны характарызуюцца наступнымі лічбамі. Ураджай буракоў па Горацкай дасьледчай станцыі і саўгасах Аршанскай акругі ў залежнасьці ад татунку ўгнаеньняў і плошчы досьледаў склаў ад 242,5 да 290 цэнтнэраў, а выхад цукру з іх хістаўся ад 35,2 да 49,6 проц.

Такім чынам, на падставе даных разьвядзеньня культуры цукровых буракоў і досьледаў у 1928 г. можна зрабіць наступныя вывады:

Беларускія буракі маюць даволі цукру і ў гэтых адносінах мала чым уступаюць украінскім.

Па ўраджайнасьці і выхадзе цукру на гэктар яны ня ўступаюць і ва многіх выпадках перавышаюць сярэднія лічбы, атрыманыя на Украіне.

Беларускія буракі характарызуюцца таксама вялікай сакавітасьцю (у сярэднім 94,04 проц.), невялікім параўнаўча процантам «ня цукру» (у сярэднім 2,8 проц.), высокім процантам лісьця ў агульным ураджаі (да 46,7 проц.) і высокай добраякаснасьцю (да 93,65 проц.).

Існаваньне цукровых заводаў у Беларусі ў ранейшым часы і вынікі адзначаных вышэй досьледаў абвяргаюць думку, што «зона прамысловага распаўсюджаньня цукровых буракоў знаходзіцца на поўдзень ад Беларусі».

Гэта абвяргаецца таксама, папершае, існаваньнем цукровых заводаў ва ўсходняй Прусіі (у Растэнбурзе і Марыенбурзе), якія знаходзяцца на аднэй шырыні з Беларусьсю і якім уласьцівы тыя самыя клімацічныя глебавыя ўмовы, што і Беларусі. Падругое, прыкладам можа служыць разьвіцьцё цукровай прамысловасьці ў ПАЗШ (у Віскансіне, які, як сьцьвярджае праф. Каган, зьяўляецца па клімаце аналёгічным Беларусі). Між іншым, па даных амэрыканскіх дасьледчых станцый, высокая прадукцыя цукру атрымліваецца іменна пры ўмеркаванай тэмпэратуры і большай працяжнасьці дзённага асьвятленьня. Такія якраз асабліваські клімату Беларусі.

Апаскі, што выказваюцца некаторымі наконт таго, што магчыма канкурэнцыя дзьвёх культур—буракоў і бульбы—маюць пад сабой мала падстаў. Штат Віскансін, дзе разьвіта культура буракоў, і па культуры бульбы займае адно з першых месц сярод іншых штатаў Амэрыкі. Ва ўсходняй Прусіі побач з культурай буракоў разьвіваецца ўсё шырэй і культура бульбы.

Сёлета мы ў справе вывучэньня пытаньня аб разьвядзеньні цукровых буракоў у Беларусі робім яшчэ адзін крок наперад. Праграмай работ Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна і на сродкі, што асыгнаваны Цукратрэстам, прадугледжваецца арганізаваць досьледы культуры цукровых буракоў у 60-ці пунктах Беларусі.

Досьледы гэтага году зьявяцца рашаючымі ў тым, сэнсе, ці магчыма ў розных раёнах Беларусі атрымаць буракі з высокім процантам цукру.

Па Савецкай Беларусі

Падрыхтоўка настаўнікаў з беспрацоўных

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У горадзе адкрываюцца 4-х месячныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў з ліку беспрацоўных, якія атрымалі сярэднюю асьвету. На курсы будзе прынята 100 чал.

Вэлёсыпэдны прабег Гомель—Менск

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Аўтадор нарашыў арганізаваць 1-га ліпеня вэлёсыпэдны прабег Гомель—Менск.

Палітсуд над антысэмітызмам

ЖЛОБІН. (Наш кар.). У клюбе саматужнікаў адбыўся палітсуд над антысэмітызмам і шавінізмам. На суд зьявілася больш 500 рабочых. Суровы прыгавор суду рабочыя сустрэлі апладысмэнтамі.

Тыдзень Аўтадору

БОБРУЙСК. У горадзе адбылася вялікая дэманстрацыя, прысьвечаная тыдню Аўтадору. У дэманстрацыі прымалі ўдзел чырвонаармейскія часьці, аўтабусы, легкавыя аўтамабілі, матацыклы, бранявыя, пажарныя машыны і вэлёсыпэдыстыя гораду. Пасьля дэманстрацыі быў наладжаны выезд у вяколічныя вёскі.

Віды на ўраджай

ГОМЕЛЬ. Акруговая экспэртная камісія дала наступную ацэнку ўсходам пасеваў: жыта—3 балы, пшаніца азімая—2,9; пшаніца яравая—2,9, ячмень—3; авёс—3,1; травы—3,3.

***

МАЗЫР. Дажджы, якія прайшлі ў акрузе значна палепшылі становішча пасеваў. Становішча пасеваў у бягучым годзе лепшае, чым у мінулым.

Фабрычны гарадок у Магілеве

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Горад чыноўнікаў, гандляроў і мяшчан паступова ператвараецца ў прамысловы цэнтр БССР.

За горадам, недалёка ад тэрыторыі, занятай пад пабудову фабрыкі штучнага шоўку і заводу мастаўя, пачнецца пабудова мылаварнага і косьцяапрацоўчага заводаў. Такім чынам, каля Магілева будзе заснаваны вялікі фабрычны гарадок. Ток прадпрыемствам дасьць Асінаўская электрастанцыя.

„Зьвязда" дапамагла

АДДАНЫ ПАД СУД

У нумары «Зьвязды» ад 4/1 29 г. быў зьмешчаны артыкул **«Аб сланёх з прыватнага таварыства «Слонь»** (м. Койданава). Аўтар у артыкуле выкрыў махінацыі прыватнікаў. Бухгальтэрыя ў таварыстве была так пастаўлена, што сыстэматычна ўтойваліся сапраўдныя прыбыткі і заўсёды паказваліся меншыя. Потым у «Зьвязьдзе» ад 15/V г. г. быў зьмешчаны артыкул **«Як Менскі Акрфа прагледзеў слаяя».** Гэта—вынікі расьследваньня справы НК РСІ. Як паведамляе НКФ Бел. ім зроблена 13/V г. г. распараджэньне аб прыцягненьні да судовай адказнасьці членаў і бухгальтара таварыства **«Слонь»** і ўсіх асоб апарату Менскага акрфа, вінаватых у недаўліку даходаў таварыства».

ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ

У допісе **«Незразумелае сяброўства»** селькор **«Ведаючы»** нам пісаў, што ў **Крукоўскім лясьніцтве** (Бабруйшчына) працуе дзеловодам **Сьцяпанаў,** Янка Лявонаў, той самы **Сьцяпанаў,** які ў Дзянікінскай армії даслужыўся да «пана паручніка». А цяпер гэты «паручнік» сыстэматычна п'янствуе з усімі ад гэтага вынікамі. Аб гэтым ведаў акр. інсп. лясоў т. **Кауфман,** але ня прымаў ніякіх мер. Селькор пытаўся: «калі-ж адрэжуць у т. Кауфмана гэты белагвардзейскі апэндыцыт?» Бабруйская АКК-РСІ паведаміла, што **Сьцяпанаў** зьнят з працы, а адносна Кауфмана **справа высьвятляецца.**

ПАЛОЖАН КАНЕЦ

Рабкор пісаў у «Зьвязду», што ў **Махаедаўскім** лясьніцтве (Мазыршчына) —п'янае царства. П'яніцы арганізаваліся навакол памочніка лясьнічага **Міраненка.** Калі гаварылі, што трэба разагнаць п'яніц, **Міраненка** казаў: «пляваць мне на вас». Рабкор у заметцы пытаўся—«калі-ж гэтаму будзе наложан канец».

Мазырская АКК-РСІ паведамляе, што **Міраненка, Гайдук, Кузьменка і Іваноў** зьняты з працы. Лясьнічаму т. **Чакідоўскаму** за слабае рэарганізаваньне на факты п'янства, **абвешчана вымова.**

19-га чэрвеня пачынаецца чыстка ЦСУ

У зьвязку з прызначэньнем т. Вансоўскага на іншую работу—старшынёй камісіі па чыстцы ЦСУ прызначан тав. ДРЫЛЕНКА (нам. старшыні Цэнтральнага Савету ТДА Авіяхім).

Члены камісіі прымаюць вусныя заявы ў памяшканьні НК РСІ Бел., 2-гі паверх, пакой № 5 штодзенна ад 6 да 8-мі гадз. увечары да 16-га чэрвеня ўключна.

Чыстка ЦСУ пачынаецца на адкрытым пасяджэньні камісіі 19-га чэрвеня ў памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых, а 6-й гадз. увечары.

Запрашаюцца рабочыя, делегаты, члены гаравету, служачыя і ўсе працоўныя.

КІНО

„Скрозь сьлёзы"

(«Культура»)

Кіно-апавяданьне «Скрозь слёзы» зроблена паводле твору вядомага яўрэйскага пісьменьніка Шолам Алэйхема. Тэма яго—трагедыя местачковага яўрэйства, зацісьнутага пры царызьме ў кіпцюрох нацыянальнага і сацыяльнага ўціску. Як мала трэба беднаму яўрэйскаму рамесьніку—краўцу, шаўцу, цесьляру,—але як і тэтае малое цяжка дастаецца! І гэтыя радасьці, гэты сьмех—сапраўды скрозь слёзы... Пяцьдзесят год жыў бедняк кравец з сваёю жонкаю і захацелася ёй мець казу. І колькі бяды нарабіла гэтая каза... Дробязь разьбівала ўсе надзеі нават і на тое куртатае шчасьце яўрэйскае беднаты...

Гэты багаты трагічнасьцю матар'ял рэжысэр Грышэр здолеў падаць неяк мякка, бяз лішняе крыклівасьці і таму фільм робіць вялізарнае ўражаньне: над сьмешным сьмяешся, але сам чуеш, што сьмяешся скрозь сьлёзы. Мы мусім асобна адзначыць і сацыяльны бок фільму яўрэй-багацей такі-ж вораг яўрэйскае беднаты, як і паліцэйскі, які багацеяў і рабінаў ратуе ад разьюшанага натоўпу яўрэйскіх рамесьнікаў.

З артыстых многія граюць добра, але асабліва вызначаюцца Піня (Вабнік), кравец (Каварбэрг) і настаўнік (Заслаўскі). У агульным здавальняючая і работа апаратараў.

В.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— У пятніцу, 14 чэрвеня, у тэатры «Прафінтэрн» для сяброў саюзу працасьветы і мэдсанпрацы будзе паставлен спэктакль Ленінградзкім «Красным театром»—камэд. В. Лебедзева «Холцевые штаны». Білеты па заяўках мясцкомаў і групкомаў у саюзах.

— 14-VI а 5-ай гадзіне дня ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Ляц Волі, Дом Прэсы, другі паверх, пакой № 10) адкрываецца III-ці Пленум ЦБ Пралетстуду ЦСПСБ.

Парадак дня:

1) Даклад Прэзыдыуму ЦБ Пралетстуду.
2) Аб працы па падрыхтоўцы новых кадраў навуковых працаўнікоў.
3) Аб пераходзе на непарыўную вытворчую практыку.
4) Аб працы навукова-тэхнічных гурткоў.
5) Выніві правядзеньня анкетнага абсьледваньня студэнцтва БССР.
6) Бягучыя справы.

На пленум запрашаюцца прадстаўнікі запікаўленых арганізацый і установаў, сябры і кандыдаты Выканбюро, Прафкомаў і Прафсэкцый навучальных установаў г. Менску і ўсе студэнцкія акадэмпрацаўнікі навучальных установаў.

Жанаддзел Кастрычнікавага райкому КП(б)Б паведамляе, што делегацкі сход, назначаны на 14-е чэрвеня г. г., адкладваецца. Аб дні скліканьні будзе паведамлена асобна.

— У пятніцу, 14 чэрвеня, а 6 гадзіне ўвечары, у Доме Пісьменьніка адбудзецца сход камуністычнай фракцыі Бел. Асоц. Пралет. Пісьменьнікаў.

Прысутнасьць усіх партыйцаў і камсамольцаў—членаў Бел. АПН—абавязковая.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

Беллдзяржтэатр.
Гастролі Ленінградзкага «Красного Театра».
Чацьвер, 13 чэрвеня. Адкрыты спэктакль.
НАУГАД
Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч.
Білеты ў касе тэатру ад 5—8 гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Сёньня і штодзённа МАСТАЦКІ БАЯВІК Скрозь сьлёзы. Кіно-апавяданьне у 7 ч. паводле твору ШОЛОМ-АЛЕЙХЕМА. Пач. роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 6 гадз.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новы вямецкі баявік ДОНА-ЖУАНА. 2 сэансы—пачатак 1-га а 9 г., 2-га а 10 г. 30 м. Каса ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкі фільм ЗЯМЛЯ КЛІЧА у 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз.

КІНО Пралетары — Мастацкі фільм 3-я маладосьць арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Пачатак сэансаў а 7 г. 30 м. Каса ад 6 г.

КІНО Спартак — ВІЛЬЯМ ХАРТ у новай амэрык. трука-прыгодніцкай кіно-фільме РАСПЛАТА (з-за жанчыны каханай) драма ў 7 частках. Каса—ад 6 г., пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

ЧАЦЬВЕР, 13 чэрвеня
ДЗЯРЖЦЫРК
Выключная ў сэзоне праграма
1-шы раз у БССР заслуж. арт. рэспублікі Грузіі Бр. ТАНЦІ
1-шы раз у БССР сусьветны артысты Максімільян ТРУЦЬЦІ
Лепшая ў СССР трупа акрабатаў 10 ОКЕАНОС 10
1-шы раз у БССР дзярж. стайня пад віраўн. вядом. Італьянск. дрэсыр. ДЖЫЯВАНІ новая дрэсыроўка.
1-шы раз у БССР масквічы АЛЬПЕРАЎ І МАКС клёуны-сатырыкі у новым рэпэртуары.
Гастроль трупы 4 ЮЛІАНС 4
Гастроль турністых 3 ЧАЙЧЭНКА 3
Гастроль гладыятараў 2 АЛЬБЭРТ 2
Гастроль паветр. гімнастаў 2 СТЭФАНІ 2
Гастроль (перш) ДОН-ДЫЕГО
Па дывану—улюбенец публікі Чарлі Чаплін.
З прычыны грандыёзн. праграмы—пачатак роўна а 9 г. увеч.
Па заяўках фабзаўкомаў і мясцкомаў—СКІДКА.

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды
ЭСЕНТУКІ № 20 Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОУСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | БАРКОМ
Са складу 25% адпускаюцца па гуртавых цэнах з дармовай дастаўкай на дом.
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.
Патрабуйце ўсюды каўкаскія натуральныя мінэральныя воды!
Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.
Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.
НАРЗАН ЭСЕНТУКІ № 20.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

АДКРЫТА
ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА
Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6.
Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болю, лячэньне хвароб поласьці роту.
УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на каўчуку і золаце.
Цэны агульнадаступныя. Парада дармова.
У лячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам.
Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА.
Прыем з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзенна.

Белбюро сэкцый гандлёвых служачых ЦП саюзу СГС склікае
14 ЧЭРВЕНЯ, роўна а 7 з пал. гадз. увечары, у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых
дэлегацкую канфэрэнцыю гандлёвых служачых г. Менску.
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Справаздача Белбюро; 2) даклад аб р